Чаму нібыта магнітам прыцягваюць гараджан некалькі сотак зямлі? Магчыма, дача — гэта спосаб перамяніць абстаноўку, збегчы ад гарадскога тлуму. А мо толькі імкненне атрымаць прыбытак? СТАР. 5

Чым пагражае нашаму здароўю надыход спёкі? Галоўным чынам пераахалоджваннем і абязводжваннем. Калі мы моцна пацеем і страчваем шмат вады, парушаецца электралітны баланс крыві... СТАР. 5

У мінскіх ЗАГСах пачаўся летні вясельны бум. У Фрунзенскім раёне распісаны ўсе пятніцы і суботы аж да кастрычніка. У Кастрычніцкім — каля 70% маладых — жыхары іншых рэгіёнаў Беларусі... СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

18 ЧЭРВЕНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 110 (27475) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ДЗЕЙНІЧАЦЬ АПЕРАТЫЎНА

Беларусь зацікаўлена выбудоўваць эфектыўныя адносіны з рэгіёнамі Сібіры па ўсіх напрамках узаемадзеяння. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з паўнамоцным прадстаўніком Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Сібірскай федэральнай акрузе Віктарам Талаконскім, перадае БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з моманту яго сустрэчы з Віктарам Талаконскім ужо мінула 12 гадоў, і за гэты час Беларусь і Сібірскі рэгіён далёка рушылі наперад у арганізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Аб'ёмы знешняга гандлю Беларусі з Сібірскай федэральнай акругай выраслі больш як у 5 разоў, а з Новасібірскай вобласцю, якой вы кіравалі 10 гадоў, амаль у 10 разоў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі, звяртаючыся да Віктара Талаконскага.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь, выбудоўваючы ўзаемадзеянне з Расіяй, заўсёды надавала прыярытэтнае значэнне развіццю прамых сувязей з яе суб'ектамі. «Дзякуючы гэтай рабоце намі закладзены трывалы фундамент не толькі для паспяховага развіцця міждзяржаўных адносін, але і для далейшага арганічнага пашырэння інтэграцыйных працэсаў паміж нашымі краінамі», — лічыць Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, сібірская федэральная акруга займае значнае месца ў гандлі Беларусі і Расіі. Па выніках 2012 года сумарны тавараабарот Беларусі з рэгіёнамі акругі дасягнуў амаль $1,5 млрд. Вядучымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі з'яўляюцца Кемераўская, Новасібірская, Омская, Іркуцкая вобласці, Краснаярскі і Алтайскі краі.

У мінулым годзе прыкметна актывізаваліся двухбаковыя кантакты, Беларусь наведалі прадстаўнікі кіраўніцтва большасці сібірскіх рэгіёнаў. «Прыняты своеасаблівыя дарожныя карты па далейшым развіцці супрацоўніцтва. Мы таксама зацікаўлены ў інтэнсіфікацыі ўзаемадзеяння з рэспублікамі Хакасія, Алтай, Бурацыя і Тыва, Томскай вобласцю і Забайкальскім краем», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт Беларусі прапанаваў кіраўнікам Хакасіі і Томскай вобласці, якія знаходзяцца ў складзе расійскай дэлегацыі, «не адкладаючы надоўга правесці ў гэтым годзе абмен візітамі афіцыйных і дзелавых дэлегацый». «Упэўнены, што гэта дасць магчымасць дакладна вызначыць асноўныя напрамкі развіцця двухбаковых адносін на перспектыву», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аснову беларускіх паставак у рэгіёны Сібіры складае тэхніка і запчасткі да яе. У Беларусь імпартуецца вугаль, грузавыя вагоны, вуглярод, каўчук, камплектуючыя. Прэзідэнт Беларусі запэўніў, што краіна па-ранейшаму гатова задавольваць патрэбнасць Сібіры ў той прадукцыі, якую традыцыйна пастаўляе Беларусь. «Аднак думаю, нам варта павялічыць ва ўзаемным гандлі долю высокатэхналагічнай і навукаёмістай прадукцыі. Больш задзейнічаць сферу паслуг. Беларускія спецыялісты маглі б прыцягвацца да праектаў у сферы будаўніцтва, распрацоўкі прыродных рэсурсаў, сельскай, камунальнай, лясной гаспадаркі», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што па выніках візіту Беларусь і Сібірскі рэгіён змогуць значна рушыць наперад у супрацоўніцтве. «Нам няма чаго прыглядацца адзін да аднаго. Давайце дзейнічаць аператыўна, актыўна, тым больш што час сёння такі, што ўвесь свет у крызісе, і спадзявацца на гэты далёкі свет няма чаго. У нас ёсць вопыт супрацоўніцтва ў адной дзяржаве, таму давайце рухацца наперад, зыходзячы з гэтага вопыту», — прапанаваў Прэзідэнт.



Фотадымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

САЛОДКАЯ ЗМЕНА

На Быхаўскім кансервава-гароднінасушыльным заводзе ў гэтыя дні поўным ходам ідзе выраб варэння з клубніц. Ужо апрацавана і зварана каля 10 тон ягады, якую прывезлі сюды з Брэстчыны. Спачатку ягады сартуюць, мыюць, засыпаюць цукрам (на фотаздымках), настойваюць 12 гадзін. Вараць у спецыяльным абсталяванні. Варэнне і джэм фасуюцца ў шкляную тару ёмістасцю па 450 грамаў. Ужо расфасавана каля 50 тысяч слоікаў. У бліжэйшыя дні на прадпрыемства будзе завезена не менш за дзесяць тон клубніц.

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар ЯКЖЫК, намеснік міністра адукацыі:

«Каб яшчэ больш павялічыць прыток замежных студэнтаў у нашу краіну, установам адукацыі варта больш актыўна адкрываць спецыяльнасці на англійскай мове. Таксама перад імі стаіць задача развіцця дыстанцыйнай формы навучання. Бо гэта дзейсны механізм павелічэння экспарту паслуг адукацыі ў краіны, якія знаходзяцца далёка ад Беларусі. Неабходна ўкараняць інтэрактыўныя формы работы з замежнымі ВНУ. Цяпер пад экспартам адукацыйных паслуг у асноўным падразумяваецца навучанне студэнтаў-замежнікаў, але на гэтую з'яву трэба глядзець шырэй. Ёсць магчымасці дыстанцыйнага кансультавання, арганізацыі і рэалізацыі з дапамогай інтэрнэту сумесных праектаў. Неабходна ствараць адукацыйныя структуры за мяжой: падрыхтоўчыя аддзяленні, прадстаўніцтвы, цэнтры, факультэты, філіялы».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.06.2013 г.

Долар ЗША	8670,00	▼
Еўра	11550,00	▼
Рас. руб.	273,50	▲
Укр. грыўня	1062,89	▼

ПЕРСІДСКІ ЗАЛІЎ — ПЕРСПЕКТЫЎНЫ НАПРАМАК

Беларусь і холдынгавая кампанія «Рыяда Груп» пачынаюць рэалізацыю сумесных праектаў, у тым ліку па пастаўках беларускай тэхнікі ў рэгіён Персідскага заліва. Гэтыя пытанні абмяркоўваліся 17 чэрвеня на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком холдынгавай кампаніі «Рыяда Груп» шэйхай Дэяй бінт Ібрахім Аль-Халіфай, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

На перагаворах бакі пацвердзілі ўзаемную зацікаўленасць у развіцці супрацоўніцтва, якая была выказана ў час папярэдняй сустрэчы, што адбылася ў сакавіку ў Сінгапуры.

«Як і дамаўляліся, мы абмяркуем асноўныя пытанні нашага супрацоўніцтва, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Прайшоў пэўны час, мы пачалі рух у патрэбным напрамку і цяпер разглядаем актуальныя праблемы, якія датычацца паставак нашай тэхнікі за межы Беларусі». Прэзідэнт запэўніў, што Беларусь гатова да самага цеснага і плённага супрацоўніцтва па ўсіх пытаннях, якія былі ўзняты на сустрэчы ў Сінгапуры. «Калі з вашага боку будзе рух насустрач, то мы можам хоць сёння пачынаць працаваць», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Акрамя таго, як заявіў Аляксандр Лукашэнка, вядома, што ідзе прапрацоўка прапаноў па іншых напрамках, у тым ліку па пастаўках малака, буйнатанажных самазвалаў. «Задумы ў нас вельмі маштабныя, калі ўсё атрымаецца, то гэта будзе сапраўдны прарыў», — выказаў упэўненасць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік холдынгавай кампаніі «Рыяда Груп» у сваю чаргу адзначыла: «Мы задаволены, што ўдалося завяршыць стварэнне нашага сумеснага прадпрыемства». Пры гэтым яна высока ацаніла работу беларускіх спецыялістаў: «Мы былі добра ўражаны прафесіяналізмам і ўзроўнем экспертнай падрыхтоўкі, якія прадэманстравала беларуская каманда».

Шэйха Дэя бінт Ібрахім Аль-Халіфа таксама паведаміла, што пачалася ўжо рэалізацыя шэрагу сумесных з Беларуссю праектаў.

■ Актуальна

НАВАТ НА «ДАЖЫНКАВАЙ» БУДОЎЛІ СРОДКІ ВЫКАРЫСТОЎВАЛІСЯ НЕЭФЕКТЫЎНА

Па выніках 2012 года і I квартала 2013-га Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі вывучыў сітуацыю ў будаўнічым комплексе краіны. Былі выяўлены шматлікія недахопы і парушэнні.

Не выконваюцца заданні па экспарце

Будаўнічым комплексам, уключаючы арганізацыі Мінбудархітэктуры, у 2012 годзе не выканана заданне па экспарце будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг. Пры заданні 512,2 млн долараў ЗША аб'ём экспарту паслуг склаў 417,9 млн (81,6% ад задання). Пры гэтым імпартавана будаўнічых паслуг на суму 610,9 млн долараў, у выніку чаго склалася адмоўнае сальда знешняга гандлю будаўнічымі паслугамі ў памеры 193 млн, што значна горш за ўзровень 2011-га (96,1 млн).

«Як паказаў аналіз, у асобных выпадках давядзенне заданняў па экспарце ажыццяўлялася арганізацыям Мінбудархітэктуры без належнай прапрацоўкі, — сцвярджаюць у Камітэце дзяржкантролю. — Так, будаўніча-мантажны трэст № 40, Бабруйскі завод ККД і Бабруйскі ДБК атрымалі заданне па экспарце паслуг на 2011 год у памеры 3, 5 і 3 мільёнаў долараў адпаведна, а на 2012 год — 1, 5,5 і 2,4 млн. Аднак ні ў 2011-м, ні ў 2012 годзе названыя арганізацыі будаўнічыя, інжынерныя і архітэктурныя паслугі за межамі рэспублікі не аказвалі».

Завышаецца кошт

Падрадчыкі ў многіх выпадках неэфектыўна і з парушэннем заканадаўства выкарыстоўваюць бюджэтныя сродкі, дапускаюць завышэнні аб'ёмаў і кошту выкананых будаўніча-мантажных работ па прычыне прыпісак іх аб'ёмаў, няправільнага прымянення расцэнак, цэн на матэрыялы і папраўчых каэфіцыентаў, лімітаваных і іншых выдаткаў.

Напрыклад, па аб'екце «Рэканструкцыя будынка Дзіцячага лячэбна-аднаўленчага цэнтра пад вучэбна-лабараторны корпус па вул. Паркавай у г. Баранавічы. 1-ы і 2-і пускавыя комплексы» выяўлена завышэнне кошту выкананых будаўніча-мантажных работ на суму 1,7 млрд рублёў; па аб'екце «Фізкультурна-аздараўленчы комплекс у аграгарадку Ціхінічы Рагачоўскага раёна» — на суму 0,9 млрд рублёў. Акрамя таго, за апошнія 2 гады ўстаноўлена завышэнне кошту будаўнічых работ на дарожных аб'ектах Мінска на агульную суму 3,8 млрд рублёў.

КДК ажыццяўляў і прэвентыўны кантроль: «У выніку ўдалося сэканоміць 5,3 млрд рублёў бюджэтных сродкаў на 32 аб'ектах будаўніцтва, якія ўзводзіліся да фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2012» у Горках (Магілёўская вобласць)». СТАР. 4

■ Надвор'е

ТЫДЗЕНЬ СОНЦА І ЦЯПЛА

На працягу ўсяго працоўнага тыдня на тэрыторыі Беларусі чакаецца даволі камфортнае цёплае надвор'е, паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэапрагнозаў Рэспубліканскага метэацэнтра гідрапрагнозаў Святлана РЫБАКОВА.

Сіноптыкі прагназуюць, што да пятніцы ўключна ападкаў увогуле не будзе, толькі сёння ўдзень па Брэсцкай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра 20—26, на поўдні — да 28 цяпла. У сераду ўначы будзе яшчэ халаднавата — 6—13 цяпла, удзень — тыя ж 20—26. З чацвярга стане яшчэ цяплей — 21—28 градусаў, а па паўднёвым захадзе і да 30 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, надвор'е ў Беларусі пачне мяняцца толькі ў суботу. Будзе цёпла ўначы і нават спякотна ўдзень, калі максімальная тэмпература месцамі дасягне 29—32 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

■ Спорт-тайм

ГАНДБОЛЬНАЯ «ДРЫМ-ЦІМ»

У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра новых трэнераў у беларускім спорце, удалы старт жаночай зборнай на «Еўрабаскеце» і прыгожую перамогу беларускіх гандбалістаў над славенцамі.

1. Беларуская мужчынская зборная зававявала пуцёўку на чэмпіянат Еўропы па гандболе-2014. У вырашальным паядынку нашы хлопцы адолелі адну з мацнейшых каманд свету — Славенію. З лікам 35:33 падапечныя Юрыя Шаўцова святкавалі перамогу і другі запар праход кваліфікацыйнага турніру кантынентальнага першынства. СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЛІТВЕ ДАЛІ ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО НА РАЗВЕДКУ СЛАНЦАВАГА ГАЗУ

Для амерыканскай кампаніі Chevron, якая перамагла ў конкурсе на разведку сланцавага газу ў заходняй Літве, адкрыта магчымасць прыступаць да работы: прынятыя літоўскім парламентам папраўкі ў законы, якія тычацца разведкі і здабычы сланцавага газу, падпісала прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ. У закон аб нетрах была ўнесена папраўка, зручная для Chevron. Цяпер кампанія можа без абмежаванняў запампоўваць у нетры неабмежаваную колькасць раствору з хімічнымі таксічнымі дадаткамі, 50% якіх застаюцца ў грунце.

ЦУКАР МОЖА ВЫКЛІКАЦЬ СМЯРОТНУЮ САРДЭЧНУЮ ХВАРОБУ?

Супрацоўнікі Навуковага цэнтра здароўя Універсітэта Тэхаса папярэджваюць: занадта вялікая колькасць цукру ў рацыёне можа справакаваць сардэчную недастатковасць, піша Medical News Today. Прычым, як паказалі папярэднія пошукі, зусім не абавязкова есці сам цукар лыжкамі. Дастаткова таго, што дадаецца ў напоі і апрацаваныя прадукты. Так, усяго адной малекулы метабаліту глюкозы — глюкоза-6-фасфату — дастаткова, каб паўплываць на працу сэрца. Вышэйзгаданы метабаліт можа назапашвацца, калі ў рацыёне ёсць лішак цукру і крухмалу. Дарэчы, медыкі да гэтага часу не маюць у арсенале па-сапраўднаму эфектыўнага сродку супраць сардэчнай недастатковасці. Яны здольныя толькі крыху зніжаць нагрузку на сэрца. Сувязь цукру і недастатковасці навукоўцы спачатку даследавалі на прыкладзе жывёл, а потым і на тканках чалавечага цела. Было даказана: метабаліт выклікае значныя пашкоджанні сэрца. У небяспецы, у прыватнасці, знаходзяцца людзі з высокім ціскам і ўжо наяўнымі хваробамі сэрца.

САМІТ «ВЯЛІКАЙ ВАСЬМЁРКІ» АДКРЫЎСЯ Ў ІРЛАНДЫІ

Саміт «Вялікай васьмёркі» распачаў працу ў Паўночнай Ірландыі ў абстаноўцы беспрэцэдэнтных мер бяспекі, паведамляюць інфармагенцтвы. Асцерагаючыся нападаў антыглабалістаў, брытанскія ўлады закрылі для мясцовых жыхароў нават возера, на беразе якога ўчора распачаліся перамовы лідараў G8. Для забеспячэння бяспекі прыцягнута больш за 8 тыс. паліцэйскіх. Сустрэча ў вярхах пачалася ў 15.45 па мясцовым часе з абмеркавання пытанняў сусветнага эканамічнага парадку дня. Пасля перапынку асноўнае месца ў перамовах заняў сірыйскі крызіс.



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПРЭЗІДЭНТАМ ІРАНА АБРАНЫ ХАСАН РАЎХАНІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Хасана Раўхані з выбранем на пасаду.

Былы сакратар Вышэйшага савета нацыянальнай бяспекі Хасан Раўхані атрымаў упэўненую перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у Іране, перадаюць інфармагенцтвы. Па афіцыйных даных, за яго пададзена больш за 18,5 млн галасоў, што складае звыш 50% ад агульнай колькасці. Яўка склала больш за 72%. Такім чынам, другога тура выбараў не будзе. Раўхані — вядомы рэлігійны і палітычны дзеяч, паплечнік аяталы Хамейні. Ён нарадзіўся 12 лістапада 1948 года. Атрымаў рэлігійную адукацыю ў Куме. Скончыў Тэгеранскі ўніверсітэт, атрымаўшы ступень бакалаўра ў галіне права, і Каледонскі ўніверсітэт Глазга (Вялікабрытанія), атрымаўшы ступень доктара права. Падчас ірана-іракскай вайны 1980-1988 гадоў займаў вядучыя пасады ў камандаванні ўзброенымі сіламі Ірана. У 1989-2005 гадах — старшыня Вышэйшага савета нацыянальнай бяспекі, кіраўнік дэлегацыі Ірана на перамовах па іранскай ядзернай праграме. З 1992 года — кіраўнік Цэнтра стратэгічных даследаванняў Ірана. Кандыдат ад палітычнай рэлігійнай арганізацыі Таварыства змагарнага духавенства. Прытрымліваецца цэнтрысцкай пазіцыі, лічыцца гнуткім палітыкам, якія спрабуюць знайсці кампрамісы з Захадам. Карыстаецца падтрымкай вышэйшага духавенства.

ISSN 1990 - 763X

ЦІ МОЖА РАЗВОД БЫЦЬ «ЦЫВІЛІЗАВАНЫМ»?

Аляксандр ЯЎСЕЕНКА, загадчык аддзела гомельскай гарадской газеты «Савецкі раён»

— Думаю,аб цывілізаваным разводзе размовы быць не можа. Таму што ў выніку ўсё роўна ёсць пацярпелыя. Любы шлюб трымаецца не толькі на каханні — у каго на грошах, у каго на сяброўстве, на ўзаемаразуменні, у каго на немагчымасці разбегчыся... Але ж нягледзячы на тое, як складваецца жыццё ў бацькоў, дзеці не павінны ведаць пра гэта. Нават калі пад словам «цывілізаваны» разумець нейкія маральныя ўзаемаадносіны паміж сужэнцамі, усё роўна дзеці церпяць. Ці можа быць цывілізаваным развод, калі няма дзяцей? У цывілізаваным грамадстве дзяцей не кідаюць. Нават калі яны выраслі і сталі вялікімі, яны ўсё роўна дзецьмі застаюцца і ім крыўдна, што бацькі не захавалі свае ўзаемаадносіны.

Вікторыя ХАЙКІНА, псіхолаг гомельскай гімназіі №46 імя Б. Паскаля

— Калі нельга сітуацыю выправіць, калі над узаемааднасінамі нельга далей працаваць, калі людзі дакладна разумеюць, што асобна ім будзе лепш, тады расставанне непазбежна. Калі людзі змаглі зразумець, што з імі адбываецца, змаглі дамовіцца пра тое, як ім жыць далей — гэта трэба лічыць цывілізаваным разводам, бо цывілізацыя мяркуе нейкую культуру адносін. Калі абое гатовы да гэтага кроку — гэта ідэальны варыянт. Але звычайна так не бывае. Як правіла, хтосьці ініцыятар, а другому трэба з гэтым пагадзіцца, прыстасавацца. Змяненне сямейнай сітуацыі аказвае ўплыў на ўсіх сваякоў. Развод перажываюць не толькі дзеці, але і бабулі-дзядулі. Калі дзеці дарослыя і маюць свае сем'і, для іх гэта будзе не так траўматычна, а калі малыя — гэта паўплывае на развіццё асобы дзіцяці. Даследаванні паказалі, што дзеці з сем'яў, дзе быў развод, прайграюць у сваіх сем'ях тую ж сітуацыю. Прычым робяць гэта не свядома, а толькі на пасставе той мадэлі паводзін, якая была перад вачыма ў маленстве. Дарэчы, у тых выпадках, калі людзі не разводзяцца, але ж вельмі хацелі б гэтага, негатыўны ўплыў таксама існуе. Нельга паставіць знак роўнасці паміж «цывілізавана» і «бязбольна». У любым выпадку перажыванні ёсць. На мой погляд, цывілізаваны развод прадугледжвае павагу сужэнцаў адно да аднаго. І тады ў памяць аб усім добрым, што было ў сямейным жыцці, працэс скасавання шлюбу і ўсё, што з ім звязана, адбываецца дастойна, без спроб адпомсціць ініцыятару разводу, без абраз, зневажанняў, абвінавачванняў і крыўдаў.

Уладзімір ДРАБЫШЭЎСК, свяшчэннік, кіраўнік Цэнтра сям'і і дзяцінства «Ладачкі» Гомельскай епархіі

— Варта зірнуць на шлюб і развод з хрысціянскага пункту гледжання. Шлюб — гэта таемства. Яго таямнічасць у тым, што ніяк немагчыма зразумець — як два чалавекі, зусім розныя і чужыя, становяцца адно аднаму даражэй за родных і бліжэй за самых блізкіх сваякоў. Двое становяцца адным цэлым. І ўсё ж ёсць у свеце аповесць больш сумная за смерць закаханых — гэта развод. І хоць развод разводу розніца — гэта заўсёды трагедыя і боль. Анталагічная няўдача, падобная на страту сябе... Нават калі развод — адзінае выйсце як найменшае зло. Калі сумеснае існаванне становіцца немагчымым і шлюб раней часу падышоў да завяршэння, хрысціянскае чалавекалюбства (і нават фармальная логіка) заклікае максімальна змякчыць удар. Не спрабаваць свой боль і гаркату кампенсаваць за кошт іншага. Гэта будзе толькі наступным крокам на шляху самаразбурэння.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАЧАЎСЯ ВІЗІТ ПРЭЗІДЭНТА ВА УКРАІНУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з афіцыйным візітам ва Украіну. Самалёт з кіраўніком беларускай дзяржавы па борце зрабіў пасадку ў кіеўскім аэрапорце Барыспаль, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Чакаецца, што 18 чэрвеня кіраўнік беларускай дзяржавы правядзе перагаворы са сваім украінскім калегам Віктарам Януковічам у вузкім і пашыраным складах, на якіх будзе абмеркаваны шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Па выніках перагавораў плануецца падпісанне шэрагу дакументаў.

Беларусь разглядае Украіну як прыярытэтнага партнёра, перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай галіне. Украіна з'яўляецца для Беларусі трэцім па аб'ёмах тавараабароту і экспарту гандлёвым партнёрам у свеце. Беларусь у знешнегандлёвым абароце Украіны займае чацвёртае месца пасля Расіі, Кітая і Германіі. Пры гэтым Беларусь мае стабільна дадатнае сальда двухбаковага гандлю. У 2012 годзе тавараабарот паміж дзвюма краінамі дасягнуў рэкордналь адзнакі $7,9 млрд. Пры гэтым аб'ём беларускага экспарту склаў $5,6 млрд. Ва Украіне функцыянуюць больш як 100 структур тавараправаднай сеткі, якія папулярызуюць на рынку беларускую прадукцыю, і іх колькасць пастаянна расце.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўсклаў вянок да Магілы невядомага салдата ў Кіеве. Мемарыял размешчаны ў парку Вечнай Славы і ўяўляе сабой абеліск у гонар воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аляксандр Лукашэнка прайшоў уздоўж роты ганаровай варты да манумента, спыніўшыся каля Вечнага агню. Пасля ўскладання вянка да абеліска кіраўнік беларускай дзяржавы ўшанаваў мінутай маўчання памяць загінулых у гады ВАВ. Пасля выканання дзяржаўных гімнаў Беларусі і Украіны Аляксандр Лукашэнка прыняў праходжанне роты ганаровай варты. Прэзідэнт Беларусі таксама ўшанаваў памяць ахвяр галадамору ва Украіне.

ВІКТАР КАМЯНКОЎ ВЫЗВАЛЕНЫ АД ПАСАДЫ СТАРШЫНІ І СУДДЗІ ВГС

Віктар Камянкоў вызвалены ад пасады старшыні і суддзі Вышэйшага гаспадарчага суда. Адпаведны ўказ 14 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе беларускага лідара.

■ У новых рытмах

ВІЦЕБСК РЫХТУЕЦЦА ДА ДНЯ ГОРАДА

Старажытны Віцебск напярэдадні «Славянскага базару» рыхтуецца да святкавання Дня горада. Афіцыйныя мерапрыемствы, прысвечаныя 1039-й гадавіне Віцебска, пройдуць 28-30 чэрвеня. Дарэчы, гісторыкі канстатуюць, што насамрэч Віцебск больш старажытны — заснаваны не ў 974-м, а ў 947 годзе. Па традыцыі, першыя святочныя мерапрыемствы арганізуюць у дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 26 чэрвеня.

Прыемным падарункам гараджанам, якія пражываюць у адным з новых раёнаў, стане адкрыццё тралейбуснага руху (на ўчастку праспект Будаўнікоў — мікрараён «Медцэнтр»). Нагадаю, што менавіта Віцебск у дарэвалюцыйны час стаў адным з першых гарадоў царскай Расіі і першым на тэрыторыі сучаснай Беларусі, дзе пачаў курсіраваць электрычны транспарт — трамвай. Падчас святкавання Дня горада не забудуць пра гэты факт: адбудзецца прэзентацыя адноўленага першага электрычнага трамвая. У Летнім амфітэатры пройдзе галоўны канцэрт, прысвечаны святу горада. На плошчы Перамогі вечарам адбудзецца святочная дыскатэка.

У рамках Дня горада пройдуць таксама воднае свята «На ўзбярэжжы Заходняй Дзвіны», паветранае шоу, выстава рэтра-аўтамабіляў, свята моладзевых субкультур. Адбудзецца канцэртная праграма з удзелам моладзевых груп Віцебска, спартыўныя спаборніцтвы і паказальныя выступленні альтэрнатыўных відаў спорту.

Для гараджанаў і гасцей горада таксама падрыхтавалі сюрпрызы: выступленне клубаў рэканструкцыі ў рамках акцыі «Па старонках гісторыі». Адкрыецца «Віцебскі вернісаж» — выстава-кірмаш работ народных майстроў, мастакоў, навучэнцаў мастацкіх школ і гуртоў. Адбудзецца і свята кнігі . Чакаюць гараджан і на сустрэчы з пісьменнікамі, паэтамі, удзельнікамі конкурсаў чытальнікаў. Запрацуе выстава віцебскіх друкаваных выданняў і электронных сродкаў масавай інфармацыі.

У спісе самых цікавых мерапрыемстваў — канцэрт-імправізацыя бардаў, свята «Фарбы лета» (подыум моды), «Парад нявест» са святочным шэсцем, дэфіле і абавязковым кіданнем букетаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Кралевіч Ірыне Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ВАЙСКОВЫЯ РЫТУАЛЫ

Фота БЕЛТА.

У суботу, 15 чэрвеня, у злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь адбылася ўрачыстая цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі новым папаўненнем.

Па традыцыі, павіншаваць маладых воінаў у злучэнні і воінскія часці прыбылі прадстаўнікі Міністэрства абароны, камандаванняў відаў Узброеных Сіл, мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый, родныя і блізкія вайскоўцаў.

У гэты дзень прысягу прыняло больш за 7 тысяч юнакоў, прызваных на тэрміновую ваенную службу. Да таго новае папаўненне паспела прайсці навучанне па праграмах пачатковай ваеннай і агульнавайсковай падрыхтоўкі.

Вераніка КАНЮТА.

ПРЫСЯГНУЛІ ВАЕННЫЯ ХІМІКІ

У 8-м Варшаўскім ордэна Чырвонай Зоркі палку радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны, што ў Старых Дарогах, на гэтае ўрачыстае мерапрыемства сабралася вялікая колькасць родных і блізкіх навабранцаў. Яны цярпліва выглядвалі сваіх сыноў, братоў, пляменнікаў, каханых... 38 ваеннаслужачых прыбылі служыць у полк гэтай вясной.

Словы падтрымкі і бласлаўлення на спакойную службу адрасаваў маладому папаўненню настаяцель храма імя Аляксандра Неўскага айцец Аляксандр.

— Урачысты рытуал прыняцця Ваеннай прысягі — памятны дзень у жыцці кожнага воіна, — адзначыў камандзір вайсковай часці палкоўнік Віталь БІРУЛЯ. — Словы прысягі простыя, але напоўнены глыбокім сэнсам. Прысяга — непарушны закон службы і жыцця кожнага салдата.

Начальнік войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны — **начальнік упраўлення радыяцыйнай, хімічнай, біялагічнай абароны і экалогіі Генеральнага штаба Узброеных Сіл, палкоўнік Вячаслаў СТАРКОЎ** павіншаваў юнакоў з прыняццем Ваеннай прысягі, а ўсю вайсковую часць — з новым папаўненнем, дабавіўшы: «Я спадзяюся, што маладыя абаронцы з гонарам і годнасцю будуць захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі палка».

Ад маладых воінаў выступіў радавы Аляксандр Летуноўскі, які паабяцаў з гонарам служыць сваёй Радзіме, добра засвоіць выпаўшую ім цікавую і незвычайную спецыяльнасць — вайсковага хіміка. Пасля завяршэння ўрачыстай часткі родныя і блізкія юнакоў наведалі казарму, сталовую. А потым маладыя вайскоўцы адправіліся ў першае ў іх салдацкім жыцці звальненне. У гэты дзень такое звальненне прадстаўляецца абсалютна ўсім.

Сяргей ВАЎЧКОЎ,

Старыя Дарогі.

ГАНДБОЛЬНАЯ «ДРЫМ-ЦІМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэтым матчам беларускія гандбалісты, здаецца, даказалі, што ў стане здабываць важныя перамогі і без Сяргея Рутэнкі. Зрэшты, капітан нашай каманды, які ў апошні час гуляе не так шмат з-за траўмы калена, пад канец матча ўсё ж такі з'явіўся на пляцоўцы і нават вызначыўся пяццю рэзультатыўнымі атакамі. Але сапраўдным лідарам у матчы са славенцамі быў Барыс Пухоўскі, які забіў дзесяць галоў. Нельга не адзначыць і ўдалую ратацыю нашых варатароў, якія проста фенаменальна адбівалі хуткія атакі славенцаў. Словам, сапраўдная «дрым-цім»!

2. Жаночая зборная краіны ўдала стартавала на чэмпіянаце Еўропы па баскетболе. У першым матчы падапечныя Рымантаса Грыгаса «адпомсцілі» чэшкам за ўсе папярэднія паражэнні, абгуляўшы грозных саперніц з разгромным лікам 60:39. У другім паядынку нашы дзяўчаты ўзялі верх над камандай Харватыі — 57:43. У абодвух матчах самым рэзультатыўным гульцом стала Алена Леўчанка.

А вось сваю апошнюю сустрэчу беларускі прайгралі — 67:72. Пераможную серыю нашых баскетбалістак перапынілі літоўкі. Тым не менш каманда забяспечыла сабе выхад у другі раўнд спаборніцтваў. Але нельга не адзначыць трывожны момант: у трэцім матчы запар беларускі цалкам правальваюць другую чвэрць, літаральна аддаючы перавагу ў рукі саперніцам. У трэцім матчы гэта каштавала зборнай перамогі. Рымантасу Грыгасу ёсць над чым паразважаць...

3. На мінулым тыдні адразу ў некалькіх беларускіх спартыўных камандах з'явіліся новыя настаўнікі. Так, на пасадзе галоўнага трэнера беларускай зборнай па хакей Андрэя Скабелку змяніў канадскі спецыяліст Глен Хэнлан. Новы трэнер на два гады падпісаў кантракт з Беларускай федэрацыяй хакея. Акрамя гэтага, Хэнлан таксама будзе прымаць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы стратэгіі развіцця моладзевага і юнацкага хакея. «Адчуваю, што павінен паставіць перад сабой складаную задачу, — пракаментаваў сітуацыю канадзец. — Я вельмі хацеў узначаліць зборную Беларусі і прыняць з ёй чэмпіянат свету-2014. Пяць гадоў таму я ўдзельнічаў у прэзентацыі будучага сусветнага першынства. Зараз у мяне ёсць магчымасць зрабіць наступны крок — не толькі трэніраваць зборную, але і ўсяляк дапамагаць развіццю беларускага хакея». Нагадаем, што Хэнлан ужо ўзначальваў беларускую зборную ў сезонах 2005/2006 і 2008/2009, пакуль не перайшоў у трэнерскі штаб мінскага «Дынама». Пасля беларускага этапу сваёй кар'еры экскватарат паспеў папрацаваць са зборнай Славакіі, а апошнія два сезоны займаў пасаду асістэнта каманды юніёрскай хакейнай лігі Заходняй Канады «Ванкувер Джаянтс».

Таксама новага трэнера атрымаў футбольны клуб «Дынама-Мінск». Настаўнікам бела-сініх стаў галандскі спецыяліст Роберт Мааскант. Амаль усю сваю спартыўную кар'еру галандзец правёў у футбольным чэмпіянаце роднай краіны. У 27 гадоў пакінуў вялікі спорт і стаў трэнерам. Самым значным пунктам у рэзюмэ Мааскanта значыцца пасада галоўнага трэнера польскай «Віслы». Гэты клуб пад кіраўніцтвам галандца стаў чэмпіёнам сваёй краіны. Здаецца новы трэнер «дынамаўцаў» шчыра верыць у сваіх падапечных: «Спадзяюся, што «Дынама» яшчэ пазмагаецца за перамогу ў беларускім чэмпіянаце. Галоўнае — верыць у свае магчымасці і сур'ёзна працаваць. Калі мы зразумеем, што нам не хапае свежых сіл, напэўна, набудзем новых гульцоў, калі выпадзе такая магчымасць. Словам, усё залежыць ад хлопцаў».

4. У беларускім класіка БАТЭ абыграў мінскае «Дынама» — 2:1. Здаецца, пасля не вельмі ўдалых матчаў барысаўчане ўрэшце зарабілі 3 ачкі. У жоўта-сініх вылучыліся Аляксандр Паўлаў і Віталь Радзівонаў. Лік гэтага матча мог бы застацца сухім, але на 79-й хвіліне форвард мінчан Косцін Курэля «распячатаў» вароты БАТЭ. Паўабаронца барысаўчан Аляксандр Паўлаў вельмі спакойна пракаментаваў вынік паядынку: «У гэтым сезоне хапала матчаў, калі мы валодалі татальнай перавагай, але не карысталіся шанцамі і ў выніку саступалі. У сустрэчы з «Дынама» забілі амаль усё, што маглі. Але колькасць гэтых момантаў трэба павялічваць». Гэтая перамога дазволіла жоўта-сінім заняць другі радок у турнірнай табліцы, адарваўшыся ад «Гомеля», які згуляў унічыю з магілёўскім «Дняпром», на тры ачкі.

А вось лідарская пазіцыя салігорскага «Шахцёра» выглядае больш трывалай. У матчы дванаццатага тура падапечныя Уладзіміра Журавеля атрымалі ўпэўненую перамогу над полацкім «Нафтанам» — 2:0. Абодва галы на рахунку Мікалая Януша. Сярод астатніх вынікаў адзначым валявую перамогу жодзінскага «Тарпеда» над «Мінскам» — 2:1. Вырашальным голам аказаўся рэзультатыўны ўдар Вячаслава Глеба.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

АРХІДЭЯ І ЛІЛЕЯ Ў СРЭБРЫ

Нацыянальны банк Беларусі ўчора ўвёў у абарачэнне дзве сярэбраныя памятныя манеты серыі «Прыгажосць кветак» — «Архідэя (Orchidaceae)» і «Лілея (Lilium)».

«Абедзве маюць намінал 10 рублёў, пробу сплаву 925, масу 14,14 грама, дыяметр 32 міліметры», — паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. Манеты адчаканены на «Манетным двары Польшчы» якасцю «пруф», тыражом да 8000 штук кожная.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

1 ВЕРАСНЯ... АДМЯНЯЕЦЦА?

Вучэбныя заняткі ў беларускіх школах распачнуцца сёлета не як звычайна — 1 верасня, паколькі гэты дзень прыпадае на выхадны, а ў панядзелак — 2 верасня. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі.

Першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца з 2 верасня па 25 кастрычніка, другая — з 4 лістапада па 24 снежня, трэцяя — з 9 студзеня па 21 сакавіка і чацвёртая — з 31 сакавіка па 30 мая.

Такім чынам працягласць восеньскіх школьных канікул складзе 8 дзён (з 26 кастрычніка па 2 лістапада), зімовых — 16 дзён (з 25 снежня па 8 студзеня). Вясной дзеці будуць адпачываць 8 дзён (з 22 па 29 сакавіка), а летам — 93 дні (з 31 мая па 31 жніўня). Для тых, хто завяршыў навучанне на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, працягласць летніх канікул складае 79 дзён (з 14 чэрвеня па 31 жніўня ўключна).

Таксама для вучняў I і II класаў у трэцяй вучэбнай чвэрці арганізуюцца дадатковыя канікулы працягласцю адзін тыдзень — гэта трэці тыдзень лютага (з 17 па 22 лютага 2014 года).

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЛЕГКАВІК З'ЕХАЎ У КАНАЛ

Надзвычайнае здарэнне адбылося бліжэй да вечара ў вёсцы Вязынка Маладзечанскага раёна паблізу помпавай станцыі: вадзіцель легкавога аўтамабіля не справіўся з кіраваннем і з'ехаў у канал...

— Шырыня канала тут складае 14 метраў, глыбіня — тры метры. Калі на месца прыбылі нашы супрацоўнікі, легкавік знаходзіўся ў вадзе на адлегласці сямі метраў ад берага, — паведамілі «Звяздзе» ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Па словах відавочцаў, кіроўца здолеў самастойна выбрацца з машыны праз бакавое шкло, але, не даплыўшы да берага, патануў. Выратавальнікі дасталі «Фальксваген Гольф» з канала, а работнікі Мінскага абласнога Савета АСВОД — цела кіроўцы. Праводзіцца расследаванне прычын і абставін здарэння.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГУЛЯЎ НА ЧУЖЫЯ МІЛЬЁНЫ

13-гадовы падлетак з Мікашэвічаў Лунінецкага раёна падазраецца ў тым, што ўкраў партманет з 50 мільёнамі рублёў у прадпрымальніка. Хлопец адразу зажыў на шырокую нагу. Купіў дарагія вопратку і абутак. А потым вырашыў адарыць двух сваіх сяброў. На таксі яны паехалі ў Мінск, там купілі ўсім траім планшэты і іншую тэхніку. За два тыдні юнак патраціў практычна ўсе грошы. Калі віна яго будзе поўнасцю даказана, кампенсаваць страту пацярпеламу давядзецца бацькам юнага злодзея.

Яна СВЕТАВА.

«КВЕТАЧКА» З ГАШЫШАМ

Супрацоўнікі наркакантролю Цэнтральнага РУУС сталіцы ў кватэры па вуліцы Чарвякова знайшлі буйную партыю гашышу. Тайнік знаходзіўся ў... цацачнай кветачцы.

...Аператыўнікі ведалі, што 25-гадовы раней судзімы мінчанін прывёз з Масквы буйную партыю гашышу і спрабуе наладзіць яго збыт на тэрыторыі сталіцы. Для правядзення вобыску міліцыянеры выехалі на кватэру, якую здымаў падазроны. Шукалі там больш за гадзіну. У праваахоўнікаў ужо пачалі нават з'яўляцца сумненні, што тайнік знаходзіцца менавіта ў жыллі. Да таго ж затрыманы паводзіў сябе дэманстратыўна спакойна і заяўляў міліцыянерам, што тыя марна нешта спрабуюць адшукаць.

Аднак у нейкі момант супрацоўнікі наркакантролю звярнулі ўвагу на цацачную кветку, якая вісела на карнізе. На першы погляд, нічога звычайнага — мяккая цацка, якую выкарыстоўваюць як элемент дэкору. Аднак калі яе пачалі разглядаць больш уважліва, аказалася, што «кветачка» гэтая — з сюрпрызам. У задняй частцы цацкі была прарэзана поласць, адкуль міліцыянеры дасталі скрутак. У ім аказалася плітка гашышу, а таксама ўжо расфасаваны наркотык — дзевяць поліэтыленавых пакецікаў і дзесяць папяровых скруткаў.

Агульная вага канфіскаванага склала 75 грамаў. У адносінах да затрыманага заведзена крымінальная справа. Яму пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 13 гадоў. Праводзіцца расследаванне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам ГІГІНЫМ

ЧАРГОВЫ ІСПЫТ ДЛЯ ЎЛАДЫ

У нас. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь правёў 14 чэрвеня нараду з рабочай групай, створанай па праблемных пытаннях будаўнічай галіны.

Нарада атрымалася шмат у чым знакавай, нават этапнай. Не стану засяроджвацца на прафесійных момантах будаўнічага бізнесу, тых недахопах, што былі выяўлены. Важна адзначыць палітычнае значэнне таго, што Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на праблемы, якія склаліся ў будаўніцтве.

Палітычная сістэма Беларусі ўладкавана так, што ўлада напрамую падтрымлівае дыялог з грамадзянамі. Таму кожнае непаразуменне, нявырашаная праблема правакуе напружанасць як у грамадстве, так і ў палітычных колах. Пры адсутнасці моцнай і ўплывовай апазіцыі ўлада павінна сама бачыць недахопы, што існуюць, звяртаць на іх увагу, выкараняць і інфармаваць грамадства пра вынікі гэтай дзейнасці.

Менавіта такую сітуацыю можна назіраць зараз. Будаўніцтва — сфера, якая закранае інтарэсы кожнага чалавека — даўно хвалюе беларусаў. Тут варта ўзгадаць і завышаныя цэны, і якасць будоўлі, і шмат чаго яшчэ.

Стала відавочна, што ў сучасных умовах тыя парушэнні, якія гадамі накопліваліся ў будаўніцтве, набылі палітычнае значэнне. Такім чынам, любы факт карупцыі, махлярства, ашуканства, які выяўляецца, становіцца не проста службовым злачынствам, а фактам палітычнага характару, бо наносіць шкоду палітычнай сістэме ўвогуле. Не будзе перабольшваннем сказаць, што кожны карупцыянер становіцца асабістым палітычным ворагам улады, грамадства ў цэлым.

Таму ў выніку разбіральніцтва з праблемамі будаўнічай галіны можна чакаць не толькі змянення цэн на рынку, крымінальных спраў супраць парушальнікаў закона, але і значных кадравых перастановак. Рашучасць, прадэманстраваная кіраўніком дзяржавы, дае падставы меркаваць, што будуць унесены значныя карэктывы ў парадак размеркавання дзяржаўных заказаў, фінансавання праектаў, а магчыма, і ў структуру органаў мясцовага кіравання, бо менавіта ім, найперш Мінскаму гарвыканкаму, была адрасавана асноўная крытыка.

Вядома, палітычны лад не можа існаваць у беспраблемным стане — гісторыя не ведае такіх прыкладаў. Але эфектыўнасць кіраўніцтва праяўляецца якраз у здольнасці хутка і энергічна выкараняць праблемы. У гэтым сэнсе беларуская ўлада здала чарговы залік на адпаведнасць патрабаванням грамадства.

Вакол нас. У Ісламскай рэспубліцы Іран з'явіўся новы прэзідэнт. Ім стаў Хасан Раўхані. Прычым насуперак распаўсюджанаму меркаванню пра таталітарную сістэму ў гэтай краіне выбары былі ўсеагульнымі, тайнымі, у іх удзельнічалі нават жанчыны.

У сучасным свеце бадай што не засталося класічных палітычных сістэм у тым выглядзе, як іх вывучаюць ва ўніверсітэтах у межах курса паліталогіі. У дэмакратычнай Еўропе амаль з бальшавіцкай рашучасцю насаджаецца ідэалогія неалібералізму. У ісламскім Іране праходзяць даволі свабодныя выбары, заснаваныя на канкурэнтнай барацьбе.

Чаго чакаць ад новавыбранага прэзідэнта? Хасана Раўхані называюць лібералам. Заснаваны такія ацэнкі ўсяго на двух фактах. Па-першае, некалькі гадоў таму, калі ён вёў перамовы з заходнімі краінамі адносна ядзернай праграмы, то выяўляў пэўныя схільнасці да кампрамісу. Па-другое, у час выбарчай гонкі Раўхані абяцаў палепшыць адносіны Ірана з іншымі краінамі. Аднак, калі ён і рэфарматар, то вельмі ўмераны. Нававыбраны прэзідэнт сам з'яўляецца шыіцкім багаслоўам, належыць да вышэйшай эліты Ісламскай рэспублікі. Палітычная сіла, якая яго актыўна падтрымала, называецца даволі красамоўна — «Асацыяцыя ваяўнічага духавенства».

Палітычны рэжым у Іране пабудаваны такім чынам, што прэзідэнт фармальна толькі другая асоба ў кіраўніцтве. Першае і пачэснае месца належыць пажыццёваму вярхоўнаму кіраўніку — рахбару, альбо факіху. З 1989 года гэтую пасаду займае Алі Хасэйні Хаменэі — чалавек даволі кансерватыўных поглядаў. Аднак і месца прэзідэнта ў палітыцы Ірана нельга недаацэньваць. Фактычна менавіта ён ажыццяўляе ўсё аператыўнае кіраўніцтва дзяржаўнай машынай. І ўсё ж разлічваць на нейкія імклівыя перамены таксама нельга. У Ісламскай рэспубліцы створана ўласная і эфектыўная сістэма стрымак і процівараў, якая не дазваляе адыходзіць ад карэнных пастулатаў Ісламскай рэвалюцыі і запаветаў вялікага аяталы Рухалы Мусаві Хамейні.

Таму пакуль можна проста канстатаваць: эпоха Махмуда Ахмадзінежада скончылася, пачынаецца перыяд Хасана Раўхані.

З гісторыі. Зараз імя Ягора Францавіча Канкрына вядома хіба што гісторыкам. А ў XIX стагоддзі ён, чалавек, які на працягу 19 гадоў узначальваў міністэрства фінансаў Расіі, стаў аўтарам адной з самых значных грашовых рэформ, што напрамую закранала інтарэсы нашых продкаў.

Менавіта 170 гадоў таму, 1 чэрвеня па старым стылі (13 чэрвеня па новым) 1843 года, Мікалай I падпісаў маніфест «Пра замену асігнацый і іншых грашовых прадстаўнікоў крэдытнымі білетамі».

У адпаведнасці з маніфестам выпуск дэпазітных і крэдытных білетаў Дзяржаўнага пазыковага банка спыніўся. Яны падлягалі абмену на дзяржаўныя крэдытныя білеты. Асігнацыі былі дэвальваваны. Яны выпускаліся па курсе 3 руб. 50 кап. асігнацыямі за 1 руб. новымі крэдытнымі білетамі. Абмен асігнацый спыніўся з 13 красавіка 1851 года, а абмен дэпазітных білетаў — з 1 сакавіка 1853 года.

Дэпазітныя і крэдытныя білеты 1841 года, разменныя на срэбра, абменьваліся па намінале. Акрамя таго, крэдытныя білеты выпускаліся наўзамен укладаў золатам і срэбрам. Ніякіх іншых магчымасцяў эмісіі крэдытных білетаў закон не прадугледжваў.

Размен крэдытных білетаў вырабляўся на срэбра і на золата. Разменная каса Экспедыцыі дзяржаўных крэдытных білетаў у Пецярбургу была абавязана ажыццяўляць размен без абмежавання, у Маскве — да 3 тыс. руб. у адны рукі, а ў павятовых казначэйствах — да 100 рублёў.

У выніку правядзення рэформы ў Расіі была створана сістэма грашовага звароту, пры якой папяровыя грошы разменьваліся на срэбра і золата. Крэдытныя білеты мелі на 35-40% залатое і срэбнае забеспячэнне. Заканадаўства ў галіне грашовага абарачэння, якое склалася ў выніку рэформы Канкрына, забараняла выпуск крэдытных білетаў для крэдытавання гандлю.

Як вам гэтыя падрабязнасці? Такое ўражанне, што чытаеш найноўшую зводку эканамічных навін.

■

■ Беларусь і свет

АДНОСІНЫ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Беларуска-азербайджанскія адносіны развіваюцца на высокай ноце. Дваццаць гадоў пазітыўнага развіцця беларуска-азербайджанскіх дыпламатычных адносін сталі важнай датай чэрвеня 2013 года ў знешнепалітычным календары Беларусі, аб чым сведчыць афіцыйны візіт міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея ў Азербайджан.

Вельмі ўдала прайшоў і мінулагодні візіт прэзідэнта Азербайджана ў Беларусь, сёлета чакаецца візіт у адказ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Паміж вышэйшым палітычным кіраўніцтвам склаліся вельмі давяральныя адносіны.

У Беларусі з глыбокай павагай ставяцца да азербайджанскай стратэгіі выстройвання суверэннай дзяржавы, з Баку адказваюць тым жа. Абедзве краіны ўвайшлі ва Усходняе партнёрства з ЕС, пераважна з-за таго, каб паглядзець, якія з гэтага праекта можна атрымаць эканамічныя дывідэнды, і падтрымліваюць адна адну, калі краіны ЕС аказваюць непатрэбны ціск.

Важнае значэнне для Беларусі мае і прадэманстраваная гатоўнасць Азербайджана прыходзіць на выручку ў цяжкія часы. Калі ў гэтым была неабходнасць, у Беларусь ажыццяўляліся пастаўкі азербайджанскай нафты і выдзяляліся неабходныя крэдыты.

Немалаважна, што ў Азербайджане ўжо нямала зборачных вытворчасцяў, буйных беларускіх заводаў і з'яўляецца актуальнай задача па павелічэнні іх магутнасці. А гэта неабходна для павышэння рэнтабельнасці такіх праектаў. Добрыя перспектывы для гэтага ёсць па ўсіх рэалізуемых кірунках — ад зборкі беларускіх трактароў, аўтакранаў і грузавых аўтамабіляў да камунальнай тэхнікі і аптычнага абсталявання.

Напрыклад, у час сустрэчы Уладзіміра Макея з прэзідэнтам Азербайджана было дамоўлена, што к візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Азербайджан увосень 2013 года будуць падрыхтаваны новыя сумесныя праекты ў галіне прамысловай вытворчасці.

Ёсць сур'ёзныя перспектывы ў інвестыцыйным супрацоўніцтве і з пункту гледжання азербайджанскіх інвестыцый у Беларусь. Немалыя даходы ад продажу энергарэсурсаў неабходна інвеставаць, а Беларусь з'яўляецца краінай з вялікай азербайджанскай дыяспарай, удала размешчанай у цэнтры Еўропы, вядомая сваёй стабільнасцю і спакоем.

Зразумела, гэта не Германія або Швейцарыя па ўзроўні эканамічнага развіцця, але затое і канкурэнцыі такой няма, як у гэтых краінах. Развіццё праектаў па еўразійскай інтэграцыі надае Беларусі яшчэ большую прыцягальнасць з пункту гледжання інвестыцый — краіна знаходзіцца на стыку двух вялізных інтэграцыйных праектаў, еўрапейскага і еўразійскага, што непазбежна будзе павышаць яе каштоўнасць з пункту гледжання інвестараў, паколькі, выраблячы ў Беларусі, можна прадаваць тавары як на 168-мільённым рынку Мытнага саюза, так і на 502-мільённым рынку Еўрапейскага саюза.

Сёння ў Беларусі ўжо ёсць некалькі інвестыцыйных праектаў, у якія бізнесмены з Азербайджана ўклалі свае сродкі (галоўным чынам па лагістыцы, грамадскім харчаванні і гандлі). Але сума прыцягнутых в 2012 годзе ў Беларусі з Азербайджана інвестыцый — $13,8 млн —зразумела, не можа быць прызнана здавальняючай, калі зыходзіць з рэальнага патэнцыялу Азербайджана, ужо прадэманстраванага ў некаторых іншых краінах свету.

Цікавыя для азербайджанскага боку і дасягненні Беларусі ў сферы касмасу. Як адзначыў міністр сувязі і інфармацыйных тэхналогій Азербайджана Алі Абасаў падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Міхаілам Мясніковічам у красавіку 2013 года, «нашы намеры заключаюцца ў абмене вопытам, вынікамі, сумеснай распрацоўцы інавацыйных тэхналогій і праектаў у галіне даследавання космасу».

Адным з варыянтаў можа стаць таксама супрацоўніцтва ў IT-сферы. Менавіта аб ім ішла гаворка падчас сустрэчы кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парламентам Азербайджана Мікалая Самасейкі з кіраўніком рабочай групы па міжпарламенцкіх сувязях Мілі Меджліса Азербайджана з парламентам Беларусі Зіядам Самедзадэ, якая адбылася ў маі 2013 года. Тады ж адзначаўся і патэнцыял развіцця адносін у сферы сельскай гаспадаркі.

Немалы ўзаемны тавараабарот — 223 мільёны долараў па выніках 2012 года — таксама сведчыць пра патэнцыял развіцця адносін нашых краін. Для таго, каб патэнцыял рэалізоўваўся на планамернай аснове, у 2004 годзе была створана міжурадавая беларуска-азербайджанская камісія па супрацоўніцтве, якая на рэгулярнай аснове праводзіць пасяджэнні.

Пра імкненне з боку Азербайджана развіваць адносіны не толькі ў сферы эканомікі, але і ў сферах культуры і адукацыі, сведчыць дзейнасць Бакінскага славянскага ўніверсітэта, у якім функцыянуе Цэнтр беларускай мовы і культуры. Паспяхова ажыццяўляе сваю работу і Таварыства дружбы і супрацоўніцтва «Азербайджан — Беларусь». У сувязі з 20-годдзем усталявання дыпламатычных адносін у Азербайджане правялі Дні культуры Беларусі ў Баку і Хачмазе, у рамках якіх былі наладжаны фотавыставы, канцэрты і Дні кіно Беларусі.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

■ Прамая лінія

Барыс СВЯТЛОЎ:

«Я гляджу аптымістычна на будучыню нашай культуры»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Тэлефон не змаўкаў гадзіну — нашы чытачы вельмі цікавіліся станам айчыннай культуры і захадамі дзяржавы па паляпшэнні арганізацыі працы галіны. Таму ў міністра культуры Беларусі падчас «прамой лініі» было шмат працы, часам завязвалася размова, а то і дыскусія. Адведзенага часу аказалася мала, каб адказаць яшчэ і на пытанні, якія былі дасланыя папярэдне. Адказы на найбольш важныя і цікавыя пытанні мы змяшчаем у матэрыялах «прамой лініі» на старонках газеты.

(Працяг. Пачатак у нумары за 14 чэрвеня.)

Частка II.

— Работнікі культуры, нават тыя, якія працуюць ва ўстановах, што адносяцца да іншых міністэрстваў, не могуць дазволіць сабе нармальную культуру харчавання. У кавярні хадзіць абедаць грошай не хапае. Перад маніторамі есці сухія бутэрброды ці распаўсюджваць па канторы пах падагрэтай у мікрахвалёўцы ежы — гэта некультурна. Як вы бачыце такую праблему і ў чым можа быць яе вырашэнне? *(Святлана, рэдактар.)*

— Для сябе я вырашаю гэтае пытанне вельмі проста: чым менш буду есці, тым больш спраў паспею зрабіць. Для мяне гэтае пытанне не існуе. Але ж я лічу, што трэба звяртаць увагу і на культуру харчавання. Мы маем вельмі добрыя нацыянальныя традыцыі. Памятаю з тых светлых часоў, калі працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, нават гэтыя бакі нашай культуры вывучаліся і было некалькі навуковых работ па гэтых тэмах. Уся падобная інфармацыя ў нас сістэматызавана і шкада толькі, што не выкарыстана пэўным чынам. З іншага боку, на жаль, у вырашэнне гэтага пытання ўносяць сваю карэктыроўку рынкавыя адносіны. Таму, калі ў нас ёсць прадпрымальнікі, якія хацелі б менавіта ў гэтым кірунку развіваць свае справы, няхай звяртаюцца ў Міністэрства культуры, мы разам падумаем, што можна змяніць.

— Ва ўстановах культуры ёсць план па платных паслугах. Установы розныя — адным гэта рабіць прасцей, а іншым — немагчыма. Калі ўся культура звядзецца да паслуг, то што ад яе застанецца — адна камерцыя замест духоўнасці? *(Работнік культуры, Магілёўская вобласць.)*

— Паказчык па росце платных паслуг культуры насельніцтву ў супастаўных цэнах 2004-2010 гадоў з'яўляўся адным з мэтавых паказчыкаў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. І ён даводзіўся Міністэрству культуры ў адпаведнасці з рашэннем нашага ўрада. З 2011 года гэты паказчык Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь не зацвярджаецца, ён скасаваны. Але ж у дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, прадугледжаны паказчык павелічэння пазабюджэтных даходаў дзяржаўных арганізацый штогод на 5 працэнтаў. Гэта вельмі важкі паказчык. Я лічу, што сучасныя эканамічныя ўмовы — час прыспеў для гэтага — патрабуюць ад арганізацый культуры актывізацыі дзейнасці па павелічэнні пазабюджэтных даходаў за кошт удасканалення формаў і метадаў арганізацыі вольнага часу насельніцтва, укаранення новых відаў платных паслуг культуры насельніцтва, павышэння іх якасці. Дзяржава ставіць задачу выкарыстання не толькі бюджэтных, але і ўсё большага прыцягнення пазабюджэтных сродкаў. Аднак ёсць дзяржаўная падтрымка культуры: у мінулым годзе яна склала 0,58% ад ВУП і 0,59% у гэтым годзе.

— Пасля адкрыцця Купалаўскага тэатра пасля рамонту не сціхаюць дыскусіі пра тое, што ён мусіць стаць самаакупным. Ці сапраўды ставіцца такая задача, і як гэта адаб'ецца на простых гледачах: ці змогуць яны набыць квіток? *(Алена з Мінска.)*

— Купалаўскі тэатр з'яўляецца вядучым драматычным тэатральным калектывам краіны. Яго 93-гадовая гісторыя пра гэта сведчыць. Яго сцэна з моманту адкрыцця стала цэнтрам культурнага жыцця не толькі сталіцы, але ўсёй краіны ўвогуле. Я б сказаў, што яна стала лабараторыяй стварэння і захавання нацыянальных духоўных каштоўнасцяў. Таму гаварыць пра тое, што тэатр можа адмовіцца ад нейкіх мастацкіх, грамадскіх прынцыпаў, на якіх будуецца ўся яго дзейнасць, не з'яўляецца магчымым. Гэта наш культурны сімвал, гэта брэнд нашай дзяржавы. Ён закліканы выконваць важнейшыя функцыі па захаванні нацыянальных культурных традыцый Беларусі, мовы, фарміраванні грамадскай думкі, каштоўнасных арыенціраў, павышэнні інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства. Сёння тэатр, я лічу, ідзе ў авангардзе асэнсавання актуальных праблем нашага грамадства сродкамі тэатральнага мастацтва. З 24-х найменняў бягучага рэпертуару амаль палова спектакляў па беларускай драматургіі.

Зараз тэатр заняты работай па адаптацыі спектакляў бягучага рэпертуару да новай пляцоўкі. З верасня 2013 года распачнецца праца над спектаклем «Пан Тадэвуш» паводле эпічнай паэмы Адама Міцкевіча.

Што тычыцца самаакупнасці: калі мы будзем казаць, што тэатр павінен перайсці на толькі рынкавыя адносіны ў гэтай сферы, мы тыя мэты, пра якія я казаў, тыя ідэалы, тое прызначэнне выканаць не зможам. Але часткова знайсці разумную меру ў адносінах паміж запатрабаваннямі часу і тымі ідэаламі, якія тэатр прызначаны несці ў наша грамадства, мы гэта павінны зрабіць. Таму самаакупнасці поўнай быць не можа.

Каб тэатр сёння быў самаакупны, то прыкладна 600 тысяч павінен каштаваць адзін квіток на спектакль. А сёння яны каштуюць ад 20 да 130 тысяч рублёў.

— Гэта сусветная практыка — дзяржава павінна падтрымліваць нацыянальную культуру.

— Наколькі я ведаю, у розных краінах падтрымка ідзе ад 20-15 працэнтаў да 80 працэнтаў. Няма такога, каб даставаліся ўсе 100 працэнтаў... Не трэба толькі прасіць у дзяржавы «дай», гэта спажывецкі падыход. Але ж калі адразу адпускаць калектывы ў вольнае плаванне, каб зараблялі, то можна панізіць планку, мастацкі ўзровень, і ўжо не будзе ніякай размовы ні пра выхаванне, ні пра мастацкі густ, ні пра нейкія ідэі. Тут трэба знайсці неабходную залатую сярэдзіну, у адпаведнасці з якой мы будзем і зарабляць самі, і ў той жа час дзяржава будзе падтрымліваць установы культуры.

— Цікава, у сувязі з чым сёлета вырашылі не праводзіць тэатральную прэмію? Яна была заяўлена як штогадовая...

— Справа ў тым, што немагчыма кожны год на гэтую прэмію вылучаць якаснага ўзроўню творы, спектаклі, якія выклікалі інтарэс і адпавядалі б узроўню нацыянальнай прэміі. Таму было прынята такое рашэнне, каб трохі радзей, раз на 2 гады яе праводзіць.

— У рамках прэміі ёсць намінацыя «беларуская драматургія». Яна нібыта ёсць, але спектакляў паводле сучаснай беларускай драматургіі ў тэатрах няшмат.

— У нас ёсць лабараторыя нацыянальнай драматургіі, вы ведаеце, колькі майстроў з яе выйшла. І дастаткова цікава працуюць... Сёння становішча такое, што ёсць у нас і драматычныя творы маладых, а з другога боку мы далі права кожнаму тэатру, кожнаму мастацкаму кіраўніку выбіраць з гэтых твораў тое, што яму хацелася б. Калі я задаю пытанне таму ж Мікалаю Пінігіну, то ён мне можа адказаць: «А я не бачу ніводнага твора, мне больш цікава звярнуцца да нашых класікаў сёння». Як прымусіць ўзяць? З другога боку, у нас да 50 працэнтаў у рэпертуары таго ж тэатра Янкі Купалы — творы беларускай драматургіі.

— Што вас уразіла як гледача ў беларускім мастацтве?

— Я магу гаварыць пра гэта бясконца, таму што ў тэатры бываю праз дзень. У мяне кожны вечар распісаны творчай падзеяй. Паглядзіце, якая цікавая з'ява адбываецца ў нашым рускім тэатры імя Горкага, які пачаў паказваць беларускую драматургію. Першая ластаўка — гэта п'еса Аляксея Дударава «Экзекутар», дзе ёсць зварот да твора Гогаля. Я яе паглядзеў з вялікім задавальненнем.

— Што за планы пра сумесную вытворчасць з Галівудам? І ці не пашкодзіць гэта беларускаму кіно, якое ўсё-такі павінна мець свой шлях развіцця, а не ператварацца ў здымачную пляцоўку? *(Святлана, Мінск.)*

— Беларускае кіно мае свой шлях развіцця, ён акрэслены ва ўзгодненай кіраўніком дзяржавы канцэпцыі развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2009-2014 гады. У 2012 годзе кінастудыяй «Беларусьфільм» і Белвідэацэнтрам створана 7 мастацкіх фільмаў (усяго 31 серыя), з якіх 5 сумеснай вытворчасці, 68 дакументальных і 9 анімацыйных. З мінулага года па выніках адкрытых конкурсаў мэтавыя бюджэтныя сродкі атрымліваюць і недзяржаўныя кінавытворцы. Беларускія кінематаграфісты ўдзельнічалі ў 57 міжнародных кінафестывалях, нашы фільмы атрымалі 74 узнагароды: у Арменіі, Германіі, Грэцыі, Ізраілі, Індыі, Іспаніі, Італіі, Казахстане, Літве, Расіі, Польшчы, Славакіі, Францыі, Чэхіі, Украіне. Традыцыйным стала адкрыццё Нацыянальнага павільёна Беларусі на Канскім міжнародным кінафестывалі, удзел у Берлінскім кінафестывалі. Завяршаюцца працэдуры ўзгаднення тэкстаў пагадненняў аб сумеснай кінавытворчасці з Ізраілем, Францыяй, Індыяй. Пры выбары сумесных кінапраектаў (на конкурснай аснове) мы зыходзім з уласных інтарэсаў беларускага кінамастацтва і нацыянальнай кінашколы. Разам з тым сёння стаіць задача паляпшэння мастацкай і тэхнічнай якасці фільмаў, актуальнасці іх тэматыкі, што павінна ўзмацніць іх канкурэнтаздольнасць і паспрыяць вяртанню дзяржаўных грошай у новы цыкл кінавытворчасці. З Галівудам мы будзем працаваць у той ступені, у якой зацікаўлена наша айчыннае кіно.

Не трэба толькі прасіць у дзяржавы «дай», гэта спажывецкі падыход. Але ж калі адразу адпускаць калектывы ў вольнае плаванне, каб зараблялі, то можна панізіць планку, мастацкі ўзровень, і ўжо не будзе ніякай размовы ні пра выхаванне, ні пра мастацкі густ, ні пра нейкія ідэі. Тут трэба знайсці неабходную залатую сярэдзіну...

— Усё-такі якім чынам супрацоўніцтва з Галівудам можа дапамагчы развіццю нацыянальнага беларускага кінематографа?

— Калі сёння кажуць «Галівуд», гэта цэлая сістэма кінавытворчасці, якая мае пэўныя мастацкія і тэхнічныя здабыткі ў галіне кінафабрыкі і вытворчасці фільмаў. Таму нам трэба падыходзіць да гэтага пытання вельмі дакладна. У нас сёння ёсць свае поспехі і ёсць свой кірунак у галіне развіцця кіно. Але ж калі мы кажам «кінастудыя «Беларусьфільм», мы ўкладваем два розныя сэнсы ў гэтае паняцце. Можна гаварыць пра «Беларусьфільм» як пра пэўную кінафабрыку, базу па вытворчасці фільмаў. У гэтым сэнсе адкрываюцца самыя шырокія магчымасці для стварэння сумесных фільмаў ці прадастаўлення нашай тэхнічнай базы для вытворчасці фільмаў, якія могуць быць прапанаваны з якой-небудзь кампаніі Галівуда. Калі ласка, калі ў нас танней. Сёння наша тэхнічнае абсталяванне, узровень тэхнічнага персаналу адпавядае высокім прафесійным якасцям і сусветным патрабаванням. І ў той жа час мы не абмежаваны разглядаць нашу кінастудыю як студыю па стварэнні мастацкага прадукту, фільмаў ігравых, анімацыйных, дакументальных. Пра гэта сведчыць таксама шматлікая сумесная вытворчасць, якую мы ажыццяўляем. Нічога страшнага няма, калі да нас звернуцца кінематаграфісты замежжа.

— Вельмі шмат абмяркоўвалася тэма нацыянальнага кінапрадукту, былі рэальныя сцэнарыі, з тым жа «Чорным замкам Альшанскім» паводле Караткевіча, але кожны раз нешта не спрацоўвае. У чым прычына?

— Так, адно з найбольш праблемных пытанняў — вытворчасць нацыянальнага кіно. Мы ва ўсіх дакументах прапісалі, што яно павінна быць, але ніхто не ведае, як яго зрабіць. Нацыянальны фільм расцэнь зняць, чым расказаць, якім ён павінен быць і даць канкрэтнае тэхнічнае заданне. Вядуцца пошукі. Адпаведнай камісіі, якая існуе пры Міністэрстве культуры, прапануюцца праекты, заснаваныя на сцэнарыях па творах нашых выдатных пісьменнікаў, зробленых нашымі драматургамі. Але пакуль яшчэ камісія не знайшла адпаведнага праекта, які адпавядаў бы званню нацыянальнага.

— Ці будзе Беларусь працягваць удзельнічаць у Венецыянскай біенале? Ці будзе ў нас усё-ткі падымацца сучаснае выяўленчае мастацтва? Мастакоў шмат, а рэальна ім паказаць сябе свету магчымасці няма. Вось нядаўна трыенале зрабілі, унутраную выставу. Але момант удзелу ў міжнародных мастацкіх праектах вельмі важны... *(Зміцер, мастак, Мінск.)*

— Мы будзем працягваць удзел у тым ліку і ў Венецыянскай біенале, але будзем рабіць гэта праз раз. Таму што гэта тычыцца вялікіх грошай, знайсці спонсараў вельмі складана. Калі казаць канкрэтна, можа, вы чулі пра даручэнне кіраўніка дзяржавы аб арганізацыі так званага арт-дэпо. У 2014 годзе мы павінны правесці на базе гэтай пляцоўкі выставу сучаснага мастацтва. Памяшканне, у прынцыпе, знойдзена, вырашаецца пытанне перадачы яго ад Міністэрства прамысловасці Міністэрству культуры. Механізм падрыхтоўкі самой выставы ўжо запушчаны: шукаюцца мастакі, творы, усё ў працэсе.

— Што гэта будзе за памяшканне?

— Я, можа, прыадкрыю невялікі сакрэт. Гэта цэх завода імя Арджанікідзэ на вуліцы Кульман, 1. Тое, што я ўбачыў, мне вельмі спадабалася: пад'езды, падыходы, пляцоўка і нават магчымасць арганізацыі пленэру, горада майстроў.

— Гэтае арт-дэпо будзе адкрыта не толькі для членаў Саюза мастакоў?

— Так, думаю, мы зробім больш шырока. Гэта не будзе будынак Саюза мастакоў, ён будзе, у першую чаргу, належаць Міністэрству культуры.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтавалі Ларыса ЦІМОШЫК, Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

(Заканчэнне будзе.)

■ Нефармат Святланы Яскевіч

МАМЧЫНЫ СЫНКІ

У Сямёнаўны два сыны. Адзін так і пражыў большую частку жыцця побач з маці. Ніколі жанаты не быў, працу знайшоў у вёсцы ад раённага прадпрыемства сувязі. Ад гарэлкі асабліва не адмаўляўся, але ж горкім п'яніцам не быў, інакш бы з работы даўно пагналі. Старэйшы ў свой час займеў сям'ю. Працаваў у суседнім райцэнтры, гадаваў дзяцей. І нявестка трапілася нядрэнная, думала маці, будзе пры кім дажыць на старасці гадоў. Але недзе пасля сарака былы вясковец справай свайго жыцця зрабіў гарэлку. Дзеці выраслі, і жонцы такі «спадарожнік» стаў непатрэбны. Адным словам, вярнуўся і старэйшы да маці. Яна да той пары пахавала свайго гаспадара. Ды і гаравала з сынамі. Інакш такое жыццё не назвеш. Яны, праўда, косяць сена, садзяць бульбу, даглядаюць хатнюю гаспадарку, прадукты ў доме не пераводзяцца. Ды старэйшы, на матчына гора, раз-пораз валяецца п'яны. Каму ў вёсцы чым дапаможа, разлічваюцца часта гарэлкай.

Але ж маці ёсць маці. Самой за восемдзесят, і яе найгалоўнейшы клопат: як жа ён, першынец, будзе жыць, калі яе не стане. Таму вырашыла загадзя сабраць нейкія грошы, каб было Кольку хоць на некаторы час. Са сваёй небагатай пенсіі паступова назбірала восем мільёнаў рублёў, трымаць у хаце не стала, паклала на рахунак у банку. Нават рахунак для яго зручнасці адкрыла на яго імя, каб потым сыночку не спатрэбілася праходзіць лішнія фармальнасці.

Прайшоў год, пайшоў другі. Сямёнаўне закарцела даведацца, колькі ж зараз грошай на ўкладзе. Яна ж тэлевізар глядзіць, радыё слухае, ведае, што на беларускія рублі налічваюцца нядрэнныя працэнты. Аддзяленне банка далекавата, ногі не вельмі здаровыя, таму папрасіла сына запрэгчы каня, ды пад'ехаць пацікавіцца ў ашчадную касу памерамі ўкладу. Першы раз сын спаслаўся на нейкія справы, другі раз некуды спяшаўся. Узяла кій старая ды і рушыла ў дарогу — два кіламетры пехатой.

Калі казаць строга, то работнік банка не мела права паведамляць роднай маці пра рахунак сына. Але ж у вёсцы ўсе ведаюць пра крыніцы даходаў непрацуючага ўкладчыка. Таму прыветлівая дзяўчынка, да таго ж унучка суседзяў, без лішніх слоў шчоўкнула клавішай камп'ютарады аб'явіла: «Дзевсце шэсцьдзясят тысяч».

Сталая жанчына не адразу і ўцяміла, што ёй гавораць. Стала дапытвацца, ці такія маленькія працэнты, ці, можа, гэта працэнты за месяц. Тады дзяўчо ёй патлумачыла, што сын перыядычна здымаў грошы з рахунку, і гэта ўсё, што засталося... Добра, што фельчарскі пункт там знаходзіцца побач з банкаўскай установай. Пажылой жанчыне стала дрэнна. Дзяўчаты падвялі яе да фельчаркі, тая зрабіла ўкол. Паціху гаротніца-маці ачомалася, павольна пайшла дадому...

Гэтую жанчыну я ведаю асабіста. Усё жыццё яны з мужам працавалі, выхоўвалі сыноў, здавалася б, на сваім прыкладзе. Другую бачыла толькі аднойчы. Яе гісторыю ведаю ад яе роднай сястры. Таццяна Мікалаеўна да выхаду на пенсію працавала педагогам, была ўзорнай гаспадыняй, над сынамі літаральна трэслася. Кожнаму сняданак, абед, вячэра ў час, калі толькі прыходзяць з заняткаў, з гурткоў, з секцый. Кожнаму куплялі ўсё, што маюць равеснікі, каб хаця не выглядалі горш за іншых. Абое атрымалі адукацыю. Старэйшы яшчэ так-сяк. А малодшы з юных гадоў даў зразумець бацькам, што любіць ён прыгожае жыццё — праўда, за іх, бацькоў, кошт. Ну і пайшлі начныя клубы, гулянкі, забавы. Потым яны са скуры ледзь не вылузваючыся, пабудавалі яму кватэру. Цяпер сын заяўляе, што бацькі павінны апляціць яму суперсучасны рамонт у новай кватэры. У стасунках з імі ён прызнае толькі адну катэгорыю: «Вы павінны, вы абавязаны». А тое, што ў іх даўгі з-за яго кватэры і часам на ежу не хапае ад пенсіі да пенсіі, яго не хвалюе. Сын можа нагрубіць маці, расказаць, як няправільна і сумна яны пражылі з бацькам, і паставіць у прыклад бацькоў яго дзяўчыны Дашы, якія «жывуць правільна». У іх кожныя выхадныя — госці, на стале бутэлька, якая стварае весялосць. І гэта яшчэ самыя бяскрыўдныя прыклады са стасункаў сына з маці. Таццяна Мікалаеўна, калі тэлефануе сястры, рэдкі раз не плача...

У панядзелак да мяне заехала цырульніца, а слёз стрымаць не можа. Падумалася адразу, нешта зусім дрэннае здарылася, але гэтую думку перабіла іншая: тады не паехала б яна абслугоўваць сваю кліентку. Аказалася, у яе чатырохгадовага сыночка паднялася тэмпература да 39. Сімпатычная мама крыху за трыццаць, і, відавочна, яна заўсёды так перажывае хваробы сына. І марна яе супакойваць, што ўсе дзеці хварэюць, што цяпер інфекцыі цыркулююць круглы год. Яна і з дому выйшла, прызналася, пакінуўшы малога на сваю маці, бо не магла дачакацца ўрача, якая абяцала прыйсці толькі ў сем вечара... Як жа захацелася тады, каб гэты хлопчык вырас дастойным матчыных слёз!

■ Творчыя вандроўкі

ВІЦЕБШЧЫНА — СТАРАЖЫТНАЯ І ВЕЧНА МАЛАДАЯ

Днямі дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі ў складзе 45 чалавек на чале са старшынёй Мікалаем Чаргінцом, згодна з добрай традыцыяй, адправілася ў паездку па рэгіёнах. На гэты раз — у край блакітных азёр, на Віцебшчыну.

Ніколі не забудзем

З гэтым краем звязаны імёны такіх знакамітых асоб, як Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі, Язэп Драздовіч, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч, Іван Хруцкі, Марк Шагал, Казімір Малевіч, Леанід Шчамялёў. Знаёмства з рэгіёнам пачалося з Докшыцкага раёна. Пісьменнікі наведалі мемарыял «Шунеўка», адкрыты ў 1983 годзе (аўтары — скульптар А. Анікейчык, архітэктары Ю. Градаў і Л. Левін) на месцы былой вёскі, якую 22 мая 1943 года фашысцкія акупанты спалілі разам з жыхарамі (66 чалавек), а 15 дзяцей кінулі ў калодзеж.

Пісьменнікі і журналісты сталі сведкамі незвычайнага дзейства: акцёры крок за крокам аднавілі падзеі 70-гадовай даўніны, таго страшнага майскага дня 1943-га. Нават гартанныя галасы на чужой мове, якія з дынамікаў разносі ліся над мемарыялам, гучалі звышрэалістычна. Людзі, што сабраліся сёння, каб ушанаваць памяць загінуўшых, нібыта знутры, на нейкія імгненні, змаглі адчуць іх жудасны боль, фізічны і душэўны. І словы «Прабачце, што вас не сустракаем — мы попелам сталі...», што прагучалі напрыканцы імправізаванага спектакля, сталі апагеем тых хвалюючых імгненняў, якія перажыў кожны з прысутных.

У час наведвання мемарыяла «Шунеўка».

У Бягомлі госці наведалі мясцовы музей народнай славы, дзе акрамя экскурсіі, была арганізавана выстава Віцебскай абласной бібліятэкі.

«Галоўная наша каштоўнасць — людзі»

У Віцебску пісьменнікі сустрэліся з кіраўніцтвам вобласці. Намеснік губернатара Уладзімір Цярэнцьеў і старшыня абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў сардэчна віталі гасцей, адзначыўшы вялікую ролю Віцебшчыны і Полаччыны ў эканамічным і культурным жыцці краіны. «У нас няма нафты і газу. Але галоўная наша каштоўнасць — гэта людзі», — адзначыў Уладзімір Цярэнцьеў.

У сваю чаргу, старшыня Саюза пісьменнікаў Мікалай Чаргінец падзякаваў кіраўнікам вобласці за падтрымку дзеячаў літаратуры і ўручыў Аляксандру Ацясаву хрустальнага Пегаса.

Паэты (сярод якіх былі і барды) і празаікі змаглі прадэманстраваць сваё майстэрства ў Віцебскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя М.Горкага, выступіўшы перад работнікамі культуры і адукацыі. Напрыканцы сустрэчы пісьменнікі адказалі на шматлікія пытанні і перадалі бібліятэцы свае кнігі з аўтографамі.

Бетон, метал і дружба

«Наваполацк — гэта помнік людзям 1960-х», — працытавала Петруся Броўку старшыня Наваполацкага гарвыканкама Наталля Качанава падчас сустрэчы з пісьменніцкай дэлегацыяй, адзначыўшы, што гісторыя горада нафтахімікаў вядзе адлік з 7 чэрвеня 1958 года, калі першы працоўны дэсант пераправіўся на лодцы цераз Дзвіну. На гэтым месцы цяпер адкрыты мемарыял «Першая палатка».

Сёння адкрытае акцыянернае таварыства «Нафтан» — буйны нафтахімічны комплекс. Яго прадукцыя вельмі запатрабавана як у нашай краіне, так і за яе межамі. «Цяпер тэрыторыя нафтахімічнага комплексу такая вялікая, што наш «Нафтан» можна назваць «горад у горадзе», тым больш што ў нас ёсць свае дарогі і нават святлафоры», — адзначыў падчас наведвання прадпрыемства дэлегацыяй Саюза пісьменнікаў Уладзімір Траццякоў, генеральны дырэктар «Нафтана». Паэты і празаікі наведалі комплекс гідракрэкінгу, дзе пазнаёміліся з умовамі працы нафтахімікаў.



У Полацкім Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры. Пісьменнікі Алесь Савіцкі (справа) і Славамір Антановіч каля сцяны царквы, якая пабудавана тысячагоддзе таму.

«Беларускую мову вучыла па газеце «Звязда»...

«Старажытны і вечна малады», — так можна назваць сучасны Полацк, дзякуючы якому чалавецтва ведае цяпер святую Еўфрасінню, Францыска Скарыну, Сімяона Полацкага, Усяслава Чарадзея. Ва ўніверсітэце, дзе адбылася сустрэча пісьменнікаў са студэнтамі і выкладчыкамі, таксама амаль ва ўсім спалучалася старажытнасць і сучаснасць. Напрыклад, нядаўна гэтая вышэйшая ўстанова адзначыла сваё 45-годдзе, хаця гісторыя яе існавання вядзе адлік з 1581 года, калі быў адкрыты езуіцкі калегіум. На падлозе захавалася керамічная плітка XVIII ст. Затое ў аўдыторыях — усё сучаснае. Дарэчы, ва ўнутраным дворыку прадстаўнікоў пісьменніцкага цэху сустрэлі не толькі цёплымі шчырымі словамі. Для іх прагучаў гімн студэнцтва «Gaudeamus». Прычым выконваў яго не хор, а... гадзіннік на фасадзе. Акрамя таго, тут ёсць славутасць, пахваліцца якой не можа ніякі іншы ўніверсітэт, — помнік студэнту.

Старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ і старшыня Наваполацкага гарвыканкама Наталля КАЧАНАВА.

Падчас выступленняў пісьменнікаў перад моладдзю гучалі не толькі вершы і песні, але і мудрыя словы старэйшых прадстаўнікоў дэлегацыі. Напрыклад, вядомы празаік Алесь Савіцкі адзначыў, якую вялікую ролю адыгрывае гістарычная памяць у выхаванні маладога пакалення. «Каб захаваць цэласнасць нацыі, неабходна ведаць гісторыю і культуру свайго народа. Мы маем багацейшы вопыт славы нашых бацькоў. Гэта застаецца прыкладам для новых пакаленняў», — сказаў ён.

Вельмі прыемна тое, што і ў Віцебску, і тут, у Полацку, прадстаўнікі культуры, адукацыі, студэнты вельмі цёпла сустрэлі і нас, звяздоўцаў. Нашу газету вельмі любяць на Віцебшчыне. У прыватнасці, адна чытачка прызналася: «Па «Звяздзе» я вучыла беларускую мову». І пажадала, каб узровень нашай старэйшай газеты заўсёды заставаўся высокім і каб «Звязда», як і зараз, была прыкладам для ўсіх тых, хто любіць родную мову.

Дзмітрый ПЯТРОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Погляд з будпляцоўкі

Мечыслаў ВІТКОЎСКІ,
генеральны дырэктар прадпрыемства «Рытм»:

Вузкія месцы шырокага будаўніцтва

Наша прадпрыемства на айчынным будаўнічым рынку працуе больш за 20 гадоў. Неаднойчы былі сведкамі спроб рэканструяваць будаўнічы сектар, тэрмінова падлатаць там тое ці іншае слабае звяно. Якіх у нас, на жаль, хапае.



Асноўныя, на мой погляд, — непаўнавартаснае насычэнне рынку будаўнічых паслуг, перагружаныя метадалогія разлікаў і падатковая сістэма і даволі слабыя заслоны для нізкаякаснай і нядобрасумленнай працы.

Многа гавораць сёння пра дарагоўлю будаўніцтва. Але вось парадокс — пры сапраўды даволі высокай цане квадратнага метра заробкі будаўнікоў далёка не казачныя. Зарплата ў агульных коштах складае недзе ад 15 да 20 працэнтаў. Нават у суседзяў расіян гэтая доля значна большая. У будаўнічых прадпрыемстваў з фінансамі наогул сёння складана, мала ў каго ёсць уласныя абаротныя сродкі на працоўны цыкл. А тым больш на развіццё матэрыяльнай базы ці абнаўленне тэхнікі, без чаго немагчымы прагрэс.

Заказы трэба шукаць праз тэндар. Хто хоча будаваць прыгожа і якасна, у таго там няшмат шанцаў. Бо цяпер галоўны фактар перамогі — як мага меншая цана. Падрадчыкі часам прапануюць нерэальна сціплыя лічбы. Пасля перамогі, відаць, збіраюцца гаварыць пра сапраўдныя цэны альбо спадзяюцца на ўдачу, што як-нібудзь дыплывуць. Але на будоўлі цудаў не сустракаецца: у выніку танна ўсё роўна не будзе, альбо атрымаецца звычайны даўгабуд.

Наступны працэс пасля тэндара — падпісанне дагавора. Працэс забюракратызаваны і марудны. Сабраць безліч «віз» спецыялістаў для канчатковага подпісу нялёгка. Падпісантам усе затрымкі ў рэалізацыі праекта з-за іх марудлівасці «па барабане», яны не хочуць рызыкаваць і ўсяго баяцца. Доўга вывучаюць паперы, перастрахоўваюцца. Такая сістэма склалася і ў дзяржаўных, і нават у буйных прыватных заказчыкаў.

Наогул, у галіне будоўлі сёння створана вельмі няпростая бухгалтэрыя. І каб яе весці, патрэбна значная колькасць людзей. Усё гэта і справу запавольвае, ды і на каштарыс кладзецца.

Нялёгка даецца ў Беларусі і пошук праекціроўшчыкаў. Іх у нас востра нестае. Тым больш кваліфікаваных і добрасумленных. Дзяржаўная экспертыза пасля ў працы праектантаў (вельмі нятаннай) столькі недаробкаў знойдзе! А колькі не знойдзе — бо для яе гэта не галоўная справа. Недапрацоўкі праекта павылазяць у час будоўлі і лягуць дадатковым грузам на плечы будаўнікоў.

Ведаю, што і за мяжой распрацоўка праекта — справа няхуткая. Але там праект будоўлі здаюць адшліфаным дасканальна. Бо наўкол — найвастрэйшая канкурэнцыя і няспынная бітва за ўласную рэпутацыю. І яшчэ там не баяцца складанай працы, нестандартных праектаў. У нас, на жаль, многія прывыклі да простых рашэнняў. Я гэта назіраю па тэндарах. Калі заказ традыцыйны — процьма ўдзельнікаў. Калі той, дзе трэба галаву паламаць ды здольнасці прыкласці — адразу цішыня. Так мы можам наогул развучыцца будаваць штосьці прыгожае і велічнае.

Чую прапановы зрабіць больш жорсткай сістэму ліцэнзавання ў будаўніцтве, у сертыфікацыі. Мо гэта і правільна, але, мяркую, на кардынальныя вынікі паўплываць не здольна.

Ведаю, што ў айчынным будаўніцтве працуе недзе пад трыста тысяч чалавек. Для Беларусі як бы і шмат. А кваліфікаваных працаўнікоў нестае. Чаму? У нас па-ранейшаму навучальныя ўстановы рыхтуюць даволі слабых практычных спецыялістаў. Іх потым даводзіцца вучыць самім — хоць гэта зусім не наша справа. Мы калісьці нават пасылалі людзей за свае сродкі па навуку ў Германію. А адтуль не ўсе вярнуліся. Хто вярнуўся, але потым таксама хутка сышоў, бо на іх веды быў добры попыт. Як і цяпер — выдатных спецыялістаў адрываюць з рукамі. Колькі наўкол прыкладаў, калі цэлымі брыгадамі пакідаюць будпляцоўкі і збягаюць да іншага працадаўцы, хто паабяцаў больш. Нават на працоўную кніжку і за разлікам не прыходзяць.

Парадокс — пры сапраўды даволі высокай цане квадратнага метра заробкі будаўнікоў далёка не казачныя.

А вось з дрэнным спецыялістам развітацца няпроста. Наша працоўнае заканадаўства лагоднае да іх — трэба марнаваць час і сілы на ўсе адпаведныя працэдуры.

Паўнацэннага рынку працы ў нас пакуль таксама няма. Няма і паўнавартаснага асартыменту будаўнічых матэрыялаў ці тэхнікі. У разгар сезона раптоўна можа праявіцца дэфіцыт звычайных будматэрыялаў. Мы, распачаўшы нядаўна новую будоўлю, захацелі прымяніць там цікавыя калоны. А іх у Мінску ніхто не хоча рабіць. І нам раяць — працуйце прасцей, не дурыце галаву. Толькі ў Баранавічах узяліся, а гэта ўжо іншыя ўмовы і дадатковыя затраты на лагістыку. Яшчэ хочам штосьці нестандартнае прымяніць, каб было прыгожа, — зноў ніхто не бярэцца. За мяжой, ведаю, каля будоўляў мітусяцца раі дробных фірмачак і майстроў, якія і палююць на такія нестандартныя заказы, дзе буйныя вытворцы не варушацца. У нас цішыня.

Дарэчы, пачуўшы пра нашы цяжкасці з калонамі, да нас з Прыбалтыкі звярталіся і прапаноўвалі свае паслугі. У іх наогул танней за ўсё было б купіць. Каб не дадатковыя клопаты з валютнымі разлікамі і мытнымі працэдурамі.

Няма рынку працы — няма і дысцыпліны. Да нас прыязджаў іншаземец на перамовы. І здзіўлена расказваў, як з'ездзіў паглядзець адну сталічную разрэкламаваную пляцоўку будаўніцтва. Кажа, думаў, мо ў абедзенны перапынак туды трапіў? Рабочыя сноўдаюцца адзін за другім, той курыць, той прысеў, а трэці па мабільніку размаўляе бясконца. Прараб на ўсё глядзіць лагодна. Кажа, змена ж толькі пачалася, рабочыя разгойдваюцца. Дадае — ды і што я ім магу зрабіць? Яшчэ пакрыўдзяцца ды звольняцца — дзе тады замену знайду?

Замена ёсць — гэта механізацыя. Нядаўна ў інтэрнэце чытаў аповед нашага земляка, які працаваў у Партугаліі на будоўлі. Там мясцовы майстар у адзіночку ўзводзіў цэлы трохпавярховы дом — ад падмурка да даху. І было ў яго толькі тры падсобнікі. Пабудаваў недзе за год-паўтара. Для нас гэта незвычайна. А для еўрапейцаў — не. Бо прыдумана шмат дапаможных прыстасаванняў — міні-бульдозеры, міні-экскаватары, якія з лёгкасцю замяняюць дзясяткі рабочых з шуфлямі і рыдлёўкамі. За кошт скарачэння лішніх можна і заробак астатнім падняць. Але ў нас такія навацыі яшчэ не распаўсюджаны. Па-першае — на гэта таксама спачатку трэба грошы. Па-другое, нашы гора-спецыялісты могуць запраста зламаць гэтую тэхніку і нават не пачырванеюць.

Тут мы чапляем яшчэ праблему — культуры будаўніцтва.

Я нядаўна заязджаў на будоўлю да калег. Важная будоўля, ды і здача хутка. А ў памяшканнях бруд несусветны, усё паракідана, валяецца пад нагамі. Безумоўна, перад прыходам камісіі будзе аўрал, парадак навядуць. Хаця яго лягчэй было б кожны дзень проста падтрымліваць. Я ўжо не кажу пра зручную спецвопратку без кірзавых ботаў, утульныя прыгожыя бытоўкі з гарачай вадой і камп'ютарамі. Безумоўна, гэта дадатковыя каштарысы. Але прыгажосць будоўлі пачынаецца і адсюль.

Падсумоўваючы, зазначу. Шмат ідзе гаворкі пра пераход на еўрапейскія стандарты будоўлі. І пераходзіць трэба. Каб быць канкурэнтаздольнымі на айчынным рынку і спрабаваць заваёўваць рынкі замежжа. Але тыя стандарты — гэта не толькі знешні выгляд. Гэта новы падыход і ў праектаванні, і ў сістэме разлікаў, і ў цэнаўтварэнні, і ў арганізацыі працы. Усё тут завязана ў агульную сістэму. Выхопліваць асобныя напрамкі — гэта ўжо не выйсце.

Запісаў Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ

■

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

АДЧУЙЦЕ ВЯЛІКУЮ РОЗНІЦУ

Нарматыўныя тэрміны жыллёвага будаўніцтва зацягваюцца ў тры-чатыры разы

У Дзятлаўскім раёне сістэматычна не выконваецца заданне па ўводзе жылля, якое будуецца ў тым ліку і з дзяржпадтрымкай, занепакоены Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

Адзін з даўгабудаў — 60-кватэрны жылы дом ЖБСК-12 «Усход» у мікрараёне па вуліцы Навагрудскай у г. Дзятлава. Інвестарам з'яўляецца вышэйназваны кааператыў, заказчыкам — упраўленне капітальнага будаўніцтва райвыканкама, падрадчыкам — ААТ «Будкомплекс». Калі паглядзець дагавор падраду, то аб'ект мусіў быць здадзены ў верасні 2011 года, аднак... Па стане на 1 кастрычніка 2011 года выканалі толькі 18,3 працэнта работ ад праду-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

гледжаных праектна-каштарыснай дакументацыяй. Спачатку ўвод дома быў перанесены на сакавік 2012 года, потым — на снежань, а ў далейшым — на чэрвень сёлетняга года. Цяпер там працягваюцца работы.

Паводле ацэнкі Камітэта дзяржкантролю, зацягванне ўводу жылога дома ў эксплуатацыю абумоўлена неналежнай арганізацыяй будаўнічай вытворчасці, адсутнасцю ў падпрыемства-генпадрадчыка спецыяльных машын, механізмаў і кваліфікаваных кадраў, а таксама вопыту працы на такіх аб'ектах.

Адпаведныя захады быццам і прымаліся (у прыватнасці, па прыцягненні субпадрадных арганізацый з іншых раёнаў, фінансаванні аб'екта, мерах дысцыплінарнага ўздзеяння), аднак аказаліся недастатковымі. Замест нарматыўнага тэрміну ў 10 месяцаў аб'ект будуецца ўжо 33 месяцы.

І гэты дом, дзе паміж нарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва і рэаліямі вялікая розніца, у раёне не адзіны. Будаўніцтва 20-кватэрнага жылога дома ў пасёлку Казлоўшчына (інвестар — ЖБСК-3 «Надзея», заказчык — упраўленне капітальнага будаўніцтва райвыканкама, падрадчык — ААТ «Дзятлаварамбуд») стартавала ў верасні 2010 года і доўжыцца да цяперашняга часу. Замест 8 месяцаў нарматыўнага тэрміну дом будуецца таксама 33 месяцы.

Прычынамі даўгабуду ўжо на першапачатковым этапе сталі праектныя памылкі: з зоны забудовы ўмудрыліся... не вынесці сеткі газаправода. Гэта пацягнула за сабой перагляд праектна-каштарыснай дакументацыі, паўторную экспертызу і іншыя наступствы. Далей — болей. З-за несвоечасовага рэагавання мясцовых органаў улады на праблемы, што склаліся на будоўлі, у падрадчыка пачаўся масавы адток кваліфікаваных кадраў.

Акрамя таго, супрацоўнікі КДК устанавілі, што мясцовыя ўлады, замест таго, каб накіраваць сілы на завяршэнне будаўніцтва распачатых у 2010 годзе жылых дамоў, у 2011-м узяліся будаваць яшчэ адзін (60-кватэрны дом ЖБСК-14 «Наваселец» у мікрараёне па вуліцы Навагрудскай у райцэнтры). Што атрымалася? Там таксама «паспяхова» правалены тэрміны ўводу.

Пры гэтым, акрамя зацягвання будаўніцтва і несвоечасовага ўводу аб'ектаў у эксплуатацыю, супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю выяўляюць факты няякаснага выканання падрадчыкамі будаўнічых работ (адстойванне, мураванне).

Усе вышэйзгаданыя пытанні неўзабаве будуць разгледжаны выязной калегіяй Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці ў Дзятлаўскім раёне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НАВАТ НА «ДАЖЫНКАВАЙ» БУДОЎЛІ СРОДКІ ВЫКАРЫСТОЎВАЛІСЯ НЕЭФЕКТЫЎНА

Доўга будуюць

Застаецца высокай колькасць аб'ектаў, якія будуюцца з перавышэннем нормаў працягласці будаўніцтва, канстатуюць у КДК. А гэта ў значнай меры ўплывае на павышэнне кошту будаўніцтва жылля. «У Віцебску ўсе 15 уведзеных у эксплуатацыю ў 2012 годзе шматкватэрных жылых дамоў, больш за 80% агульнай плошчы якіх было прызначана для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзены з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва ад 3 да 17 месяцаў. Пры гэтым павелічэнне кошту 1 кв. м агульнай плошчы пабудаванага жылля склала ад 26,8% да 105% ад першапачатковага, — прыводзяць прыклады спецыялісты Камітэта дзяржкантролю. — А ў Гомелі 16 з 17 шматкватэрных жылых дамоў, прынятых у эксплуатацыю ў 2012 годзе, пабудаваны з перавышэннем нарматыўнага тэрміну ад 1 да 32 месяцаў». У Магілёўскай вобласці ўвогуле на пачатку года з перавышэннем нормаў працягласці будаўніцтва ўзводзіўся 41 жылы дом, або 36% ад агульнай колькасці незавершаных аб'ектаў жылля (без уліку індывідуальных забудоўшчыкаў).

Прастой пасля мадэрнізацыі

Істотныя праблемы выяўлены КДК падчас праверак рэалізацыі праектаў па мадэрнізацыі арганізацый будаўнічага комплексу. «Так, Дзяржаўнай праграмай развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны на 2006 — 2010 гады (дзяржаўны заказчык — Мінбудархітэктуры) былі прадугледжаны нарошчванне магутнасцяў, мадэрнізацыя і новае будаўніцтва прадпрыемстваў буйнапанэльнага домабудавання (усяго 20 арганізацый ва ўсіх абласцях рэспублікі і Мінску)». Але, як паказаў аналіз, па большасці запланаваных праектаў да пачатку 2013-га мадэрнізацыя не завершана і павелічэнне магутнасцяў не дасягнута. Пры гэтым на асобных прадпрыемствах, на якіх праведзена мадэрнізацыя, вельмі нізкі ўзровень загрузкі вытворчых магутнасцяў. Напрыклад, на Магілёўскі ДМК фактычнае выкарыстанне вытворчых магутнасцяў завода буйнапанэльнага домабудавання за 2012 год склала толькі каля 30%. У таварыстве «Магілёўжалезабетон» з 2009 года практычна прастойвае новая тэхналагічная лінія па вытворчасці пліт пустотнага насцілу метадам безапалубачнага фармавання коштам 6 млрд рублёў па прычыне незапатрабаванасці прадукцыі (загрузка за 2012 год — 13,3%).

Страты ўжо пры распрацоўцы дакументацыі

Дзяржкантроль выявіў, што заказчыкамі бюджэтныя сродкі нават на распрацоўку праектнай дакументацыі выдаткоўваюцца не заўсёды рацыянальна. Унітарнае прадпрыемства «Белпрампраект» з 2008 года за кошт сродкаў бюджэту Магілёўскай вобласці адначасова ажыццяўляла двухстадыйнае праектаванне лядовых арэн у Чавусах, Глуску і Клічаве. «Улічваючы, што архітэктурна-планіровачныя рашэнні і тэхніка-эканамічныя паказчыкі архітэктурных праектаў гэтых лядовых арэн цалкам супадаюць, у выпадку распрацоўкі індывідуальнага праекта па адной з названых лядовых арэн і яго паўторнага прымянення пры будаўніцтве дзвюх іншых эканомія бюджэтных сродкаў толькі па праектаванні магла б скласці каля 1,5 млрд рублёў», — упэўнены ў КДК.

У асобных выпадках праектныя арганізацыі дапускаюць завышэнні аб'ёмаў (і цэн на іх) праектна-пошукавых работ, што выконваюцца за кошт дзяржаўных сродкаў. Напрыклад, калі прыватная праектная арганізацыя мае завышаныя расцэнкі пры распрацоўцы праектаў, кошт будаўнічых работ па рэканструкцыі трамвайных пуцей у Мінску быў завышаны на 17 млрд рублёў.

Прапановы

Рашэнне выяўленых праблем Камітэт дзяржкантролю бачыць у аптымізацыі структуры кіравання арганізацыямі будаўнічага комплексу; выпрацоўцы сістэмы кантролю цэн на будаўнічую прадукцыю, будаўніча-мантажныя работы, удасканаленні нарматыўнай базы цэнаўтварэння ў сферы праектных і пошукавых работ; павышэнні ўзроўню адказнасці органаў дзяржбуднагляду і дзяржаўнай экспертызы за якасць і своечасовасць выканання праектных і будаўнічых работ; узмацненні адказнасці заказчыкаў і падрадчыкаў за захаванне нарматыўных тэрмінаў выканання будаўнічых работ.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ДЫЯГНАЗ — НА ПРАЦЯГУ ДНЯ

Мінскі абласны радзільны дом пацвярджае званне ўстановы, добразычлівай у дачыненні да дзіцяці.

Сертыфікат на суму 100 млн рублёў ад фірмы «Аўгуст» атрымаў калектыў Клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці. Менавіта такая сума неабходна ўстанове для набыцця святлодыёднага абсталявання для дзіцячай рэанімацыі і аперацыйнай. Уручыў «дакумент» губернатар вобласці Барыс Батура, калі наведаў установу разам са старшынёй праўлення Нацыянальнага банка, кіраўніком грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Надзеяй Ермаковай і намеснікам генеральнага прадстаўніцтва ў Беларусі закрытага акцыянернага таварыства «Фірма «Аўгуст» Ігарам Кобзевым.

Мінскі абласны радзільны дом — асаблівая ўстанова. У 2001 годзе Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя і ЮНІСЕФ ёй прысвоена высокае званне «Бальніца, добразычлівая ў дачыненні да дзіцяці».

— Раддому сёлета споўнілася 33 гады. Першае немаўлятка з'явілася тут на свет 6 мая 1980-га ў 22 гадзіны 50 хвілін. Гэты дзень і час мы і лічым днём нараджэння нашай установы, — кажа галоўны ўрач Пётр Масько. — За гэтыя гады наш раддом пераўтварыўся ў магутны перынатальны цэнтр, дзе прымаецца штогод больш за 4,5 тысячы родаў, аперыруецца 2,5 тысячы жанчын. Усяго з часу заснавання нашы супрацоўнікі дапамаглі прыйсці ў гэты свет больш чым 100 тысячам немаўлят.

Мінскі абласны радзільны дом да нядаўняга часу быў практычна адзіны ў краіне, які цалкам нясе адказнасць за здароўе дзіцяці ад яго нараджэння да выпіскі. Тут паспяхова працуе так званы комплекс аддзяленняў другога этапу выходжвання нованароджаных: рэабілітацыйнае, акушэрскае, педыятрычнае.

— Амаль у шэсць разоў у нас зменшылася колькасць дзяцей, што нарадзіліся ў стане асфіксіі. Гэта вынік ўкаранення сучасных тэхналогій перынатальнай дыягностыкі. Яшчэ адна асаблівасць радзільнага дома ў тым, што ў жаночай кансультацыі дыягнастычная мамалогія працуе па прынцыпе «дыягназ на працягу аднаго дня», — адзначае Пётр Масько. — Гэта асабліва важна для жанчын, якія прыязджаюць з аддаленых раёнаў.

На Міншчыне склалася нядрэнная дэмаграфічная сітуацыя: на 6,5 працэнта павялічылася нараджальнасць, зменшылася смяротнасць. Летась нарадзілася 17800 дзяцей (амаль на 1100 больш, чым у 2011-м). Разам з тым, рост колькасці родаў у вобласці патрабуе павелічэння колькасці адпаведных устаноў. Прынята рашэнне аб будаўніцтве раддома ў Заслаўі. Магчыма, ён будзе працаваць пад эгідай абласнога, паколькі тут высокі ўзровень медыцынскага абслугоўвання.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Погляд

БЕЛАРУСЬ У БАРАЦЬБЕ З ТРАНСГРАНІЧНЫМ ЗЛАЧЫНСТВАМ

Незаконны абарот наркотыкаў — адна з найбольш сур'ёзных пагроз еўразійскаму рэгіёну. Да такога вываду прыйшлі дзяржавы-члены Еўразійскай групы па супрацьдзеянні легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму (ЕАГ) на 18-м Пленарным пасяджэнні, якое нядаўна адбылося ў Мінску.

Старшыня Еўразійскай групы па супрацьдзеянні легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванні тэрарызму Юрый Чыханчын адзначыў, што сёння для еўразійскага рэгіёна найбольш актуальным з'яўляецца прыцягненне ўвагі міжнародных арганізацый да выяўлення фінансавых патокаў ад афганскага наркатрафіку і фінансавых цэнтраў для акумулявання і інвеставання наркадаходаў. Нягледзячы на тое, што праблема носіць глабальны характар, найбольшая шкода наносіцца менавіта еўразійскаму рэгіёну. Расія мае намер выступіць з ідэяй аб стварэнні пояса антынаркатычнай бяспекі вакол Афганістана, які з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам апіятаў. Афганістан — кропка, дзе спалучаюцца дзейнасці наркавытворчых транснацыянальных сетак і такіх міжнародных тэрарыстычных арганізацый, як «Аль-Каіда». Таму беспярашкодная магчымасць наркагрошай «адмывацца» праз фінансавыя інстытуты — гэта, у тым ліку, фінансава-эканамічная база для далейшага фінансавання тэрарызму.

Яшчэ ў разгар першай хвалі глабальнага фінансавага крызісу 2008 — 2009 гадоў намеснік генеральнага сакратара ААН, выканаўчы дырэктар Упраўлення па наркотыках і злачыннасці ААН Антоніа Коста заяўляў пра тое, што ў найбуйнейшыя банкі свету для ліквідацыі крытычнага дэфіцыту ліквіднасці было ўкінута каля 352 мільярдаў наркадоларaў, якія затым былі выкарыстаны ў міжбанкаўскіх запазычаннях.

Яшчэ адзін прыклад — рэзанансная справа ў дачыненні да амерыканскага банка «Ваковія» (Wachovia), які толькі па афіцыйных даных з 2004 па 2007 гады правёў праз свае рахункі з дапамогай электронных пераводаў, дарожных чэкаў і наяўнымі грашыма 378 мільярдаў долараў на кантраляваныя мексіканскімі наркакартэлямі пункты абмену (Касас дэль камбій). Таксама ў «адмыванні» наркагрошай былі западозраны і аштрафаваны яшчэ два банкі ў ЗША — «American Express Bank» і «HSBC».

Расследаванні Упраўлення па наркотыках і злачыннасці ААН выявілі, што сёння ўваход для «брудных» грошай у легальныя фінансавыя патокі вельмі палегчаны. Пры гэтым «інвеставанне» такіх грошай сур'ёзна разбурае рэальную эканоміку і істотна абмяжоўвае эканамічны рост.

Дарэчы, Беларусь ужо сутыкнулася з гэтай праблемай. Так званыя «макавыя бубкі» — макавае насенне разам з макавай саломкай або макавае насенне, вымачанае ў апіятах, якое, згодна з меркаваннямі экспертаў, мае афганскае паходжанне, трапляе ў Беларусь пад выглядам харчовага маку і потым распаўсюджваецца сярод наркаспажыўцоў.

На думку дырэктара Федэральнай службы Расіі па кантролі за абаротам наркотыкаў Віктара Іванова, ва ўмовах фінансава-эканамічнага крызісу хранічны недахоп ліквіднасці стымулюе не толькі талерантнасць да крымінальных грошай, але і заахвочвае фінансавыя інстытуты да іх наяўнасці. Таму, з улікам набліжэння другой хвалі глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу, які па падліках некаторых экспертаў можа пачацца ўжо ўвосень 2013 года, можна прагназаваць спробы з боку транснацыянальных злачынных сетак зноў скарыстацца патрэбамі фінансавых інстытутаў у павялічэнні сваёй ліквіднасці і, такім чынам, «адмыць» свае наркадаходы.

Іншая рызыка зыходзіць з патэнцыйнага павялічэння аб'ёмаў наркавытворчасці ў Афганістане пасля пачатку вываду войскаў міжнародных сіл у 2014 годзе. Павелічэнне аб'ёмаў наркавытворчасці непазбежна прывядзе да павялічэння аб'ёмаў наркагрошай, якія будуць «адмывацца» праз фінансавыя інстытуты.

Дарэчы, Беларусь ужо сутыкнулася з гэтай праблемай. Так званыя «макавыя бубкі» — макавае насенне разам з макавай саломкай або макавае насенне, вымачанае ў апіятах, якое, згодна з меркаваннямі экспертаў, мае афганскае паходжанне, трапляе ў Беларусь пад выглядам харчовага маку і потым распаўсюджваецца сярод наркаспажыўцоў. Зразумела, што наркадаходы ад «бубачнага» бізнесу потым «адмываюцца» праз розныя фінансавыя інструменты. Таму, каб эфектыўна выяўляць гэтыя злачынныя фінансавыя патокі, трэба шырокае і глыбокае ўзаемадзеянне паміж фінансавымі разведкамі, органамі наркакантролю, унутраных спраў і іншымі дзяржаўнымі і міжнароднымі структурамі.

Сёння эфектыўная праца ў «антыадмывачнай» сферы немагчыма без выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій. Напярэдадні пленарнага пасяджэння ЕАГ у Мінску адбыўся сумесны семінар ЕАГ з Групай «Эгмант» па абмене вопытам выкарыстання інфармацыйных тэхналогій для правядзення фінансавага аналізу ў мэтах процідзеяння легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму. Зараз ідзе праца па стварэнні агульнай інфармацыйнай сістэмы паміж Групай «Эгмант» і ЕАГ для абмену ў рэальным часе інфармацыяй. «Тыя фінансавыя разведкі, што не маюць зносіны з калегамі з іншых краін, фактычна працуюць усляпую, паколькі адмыванне злачынных даходаў і фінансаванне тэрарызму — злачынствы па сваёй прыродзе трансгранічныя», — заўважыў старшыня Групы «Эгмант», кіраўнік падраздзялення фінансавай разведкі Бельгіі Верхельст Будзевін.

Арсеній СІВІЦКІ,
палітычны аглядальнік «Звязды»,
кіраўнік Цэнтра стратэгічных і знешнепалітычных даследаванняў.

Даведка «Звязды»:

Еўразійская група па супрацьдзеянні легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму (ЕАГ) — рэгіянальная арганізацыя па тыпе міжнароднай групы распрацоўкі фінансавых мер барацьбы з адмываннем грошай (FATF), якая была ўтворана па ініцыятыве Расійскай Федэрацыі 6 кастрычніка 2004 г. на ўстаноўчай канферэнцыі ў Маскве з удзелам 6 дзяржаў-заснавальнікаў: Беларусі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана.

Цяпер да ЕАГ далучыліся Індыя, Казахстан, Туркменія і Узбекістан, а статус назіральніка прадастаўлены 14 краінам і 18 міжнародным і рэгіянальным арганізацыям.

Асноўнай мэтай Еўразійскай групы з'яўляецца забеспячэнне эфектыўнага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні, а таксама інтэграцыі дзяржаў — членаў ЕАГ у міжнародную сістэму процідзеяння легалізацыі (адмыванню) злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму.

У рамках ЕАГ праводзіцца работа па трох базавых кірунках: узаемныя ацэнкі нацыянальных сістэм супрацьдзеяння адмыванню грошай і фінансаванню тэрарызму дзяржаў — членаў Еўразійскай групы; тыпалагічныя даследаванні злачынных схем адмывання грошай і фінансавання тэрарызму і тэхнічнае садзейнічанне дзяржавам членам ЕАГ, уключаючы навучанне кадраў.

Вышэйшым органам Еўразійскай групы з'яўляецца пленарнае пасяджэнне, якое праводзіцца, як правіла, два разы на год, але не менш чым адзін раз у год. У пленарным пасяджэнні прымаюць удзел дэлегацыі дзяржаў — членаў ЕАГ. Пленарнае пасяджэнне разглядае прынцыповыя пытанні, звязаныя з агульнымі інтарэсамі дзяржаў — членаў Еўразійскай групы, вызначае стратэгію і кірункі дзейнасці і прымае рашэнні рэкамендацыйнага характару, накіраваныя на рэалізацыю мэт і задач Еўразійскай групы.

■

ПІЦЕ, ПАКУЛЬ НЕ ПЕРАСОХЛА

Чым пагражае нашаму здароўю надыход спёкі? Галоўным чынам, дзвюма непрыемнасцямі: пераахаладжваннем (падчас купання, прыняцця халаднаватага душа, «злоўжывання» кандыцыянерам або вентылятарам) і абязводжваннем. Калі мы моцна пацеем і страчваем шмат вады, парушаецца электралітны баланс крыві, што прыводзіць да пагаршэння сілкавання мышачных клетак, павелічэння частаты сардэчна-сасудзістых прыступаў, зніжэння працаздольнасці, тлумачыць загадчыца аддзялення інфармацыйнага забеспячэння насельніцтва аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена АНІСАВЕЦ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Арганізм чалавека на 70 працэнтаў складаецца з вады і не можа без яе нармальна функцыянаваць. Менавіта ў водным асяроддзі адбываецца большасць жыццёва важных працэсаў нашага арганізма.

ПАСТУПЛЕННЕ ВАДЫ:

1-1,5 л — вада і вадкая ежа (напоі, першыя стравы);

1-1,5 л — з іншых харчовых прадуктаў;

0,3-0,4 л — утвараецца ў самім арганізме ў выніку біяхімічных рэакцый.

ВЫДЗЯЛЕННЕ ВАДЫ:

0,4 л — праз лёгкія, падчас выдыху;

1,4-1,5 л — праз ныркі;

0,6 л — праз скуру;

0,1 л — праз кішэчнік.

У спёку арганізм выдзяляе ў 2-4 разы больш звычайнага. Ужо не 2-2,5 л, а 4 л. Вучоныя падлічылі, што пры страце 1 л вадкасці нас пачынае мучыць смага, 2 л — зніжаецца разумовая дзейнасць, 3 л — з'яўляецца галавакружэнне, 4 л — магчыма страта прытомнасці і сардэчны прыступ.

Пастаяннае, нават лёгкае, абязводжванне прыводзіць да галавакружэння, стомленасці і раздражнёнасці. Пастаянны недахоп вадкасці можа паўплываць на псіхічную і фізічную працаздольнасць. Такім чынам, піць лепей яшчэ да таго, як у роце перасохла. Выпрацаваць пітную звычку неабходна яшчэ да 5-гадовага ўзросту.

Смага — гэта змяненне водна-салявой раўнавагі ў арганізме. Звычайна гэтая раўнавага вытрымліваецца з вельмі высокай дакладнасцю. У 1 л крыві змяшчаецца 9,45 г павараной солі. Калі канцэнтрацыя солі зменіцца ў большы бок, парушыцца нармальная дзейнасць клетак, якія забяспечваюцца крывёй. Калі мы моцна пацеем, канцэнтрацыя солі павялічваецца, і клеткі цэнтральнай нервовай сістэмы заяўляюць нам пра гэта смагай.

Разам з праблемай абязводжвання існуе і праблема лішняга прыёму вадкасці. Лішак вільгаці перагружае сэрца, паскарае працэс распаду бялку ў тканках, разбаўляе страўнікавы сок, які перастае быць бар'ерам для страўнікава-кішачных інфекцый. Калі колькасць вады ў крыві ўзрастае, то зніжаецца канцэнтрацыя мікраэлементаў, неабходных тканкам. І сімптомы перабору з вадой могуць быць тыя ж самыя — слабасць, ванітаванне, апатыя. Так што вучыцеся сачыць за тым, колькі вадкасці вы ўжываеце. І ў першую чаргу **імкніцеся піць пакрысе, кожны глыток патрымайце ў роце.**

Дарослым патрабуецца 2-2,5 л вадкасці штодня, дзецям да 2 гадоў — 1л, ад 3 да 5 гадоў — 1,5 л, ад 6 гадоў — 2 л. Падчас спёкі дарослым патрабуецца да 3 л вады на дзень.

Можна ўжываць **пітную або мінеральную сталовую ваду** (са ступенню мінералізацыі не больш за 1 г/л, звыш 10 г/л — гэта ўжо лячэбная мінеральная вада). Па здольнасці спатоліць смагу халаднаватая мінералка займае другое месца пасля гарбаты.

Калі ў вас няма гастрыту ці язвы страўніка, можаце ўжываць **газіраваную ваду.** Вуглекіслата ўзмацняе слінааддзяленне і хутчэй спаталяе смагу. Сам па сабе вуглякіслы газ бясшкодны, але яго прысутнасць у вадзе ўзмацняе страўнікавую сакрэцыю, павышае кіслотнасць страўнікавага соку і правакуе метэарызм.

Добра гасіць смагу і сухасць у роце **кіслая вада** — з лімонам або кіслымі ягадамі. Летам добра ўжываць таматны, вішнёвы, грэйпфрутавы, слівавы, алычовы і кізілавы сокі. Сокі з мякаццю, змешаныя сокі горш дапамагаюць пры смазе, хоць іх пажыўнасць вышэйшая. Аднак нельга забываць, што пры шэрагу захворванняў сокі наогул супрацьпаказаны.

Можна спатоліць смагу і **квасам**, атрыманым метадам браджэння. Квас рэгулюе дзейнасць страўнікава-кішачнага тракта, перашкаджае размнажэнню мікробаў, паляпшае абмен рэчываў, спрыяльна ўздзейнічае на сардэчна-сасудзістую сістэму, узмацняе імунітэт. Квас карысна ўжываць перад ядой тым, хто пакутуе ад гастрыту з паніжанай кіслотнасцю, сардэчнікам, гіпертонікам, людзям з аслабленай нервовай сістэмай і ўсім, хто жадае прыўзняць сабе настрой. Усё таму, што квас — гэта малочная кіслата, вітаміны групы В, кальцый, магній, фосфар, іншыя мікраэлементы і амінакіслоты. А кіслоты іграюць велізарную ролю па вывядзенні хворых і паталагічных клетак. Не рэкамендуецца піць газіраваны квас. Нельга наогул ужываць квас хворым з язвай страўніка, гастрытам з павышанай кіслотнасцю, калітам і энтэрытам, падаграй і хваробамі печані.

Вельмі падыдзе **зялёная гарбата** — цёплая або халодная, не важна. Галоўнае, яна багатая на антыаксіданты, флаваноіды, вітамін Р, які так добра ўздзейнічае на сасуды. Зялёная гарбата зніжае рызыку астэапарозу, раку, сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Кефір, ражанка, ёгурт, сыракваша, якія ўключаюць арганічныя кіслоты, таксама спаталяюць смагу. Да таго ж яны хутка засвойваюцца (за гадзіну — на 91%, а малако — толькі на 32%).

Не патрэбны ў спёку мачагонныя кава і энергетыкі, дый любы алкаголь у прынцыпе, уключаючы піва. Кава актывізуе работу нырак, а гэта прамы шлях да абязводжвання. Так што, калі ўжываеце каву, піце і паболей вады. Гэта датычыцца і чорнага чаю. Увесь алкаголь таксама прыводзіць да абязводжвання. Надта халодныя, з бурбалкамі, салодкія газіроўкі шкодзяць касцям і зубной эмалі, правакуюць дыябет, атлусценне, хваробы падстраўнікавай залозы і выклікаюць прывыканне.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Сезонная тэма

ЯКАЯ АД ДАЧЫ АДДАЧА?

Чаму многія з нашых суайчыннікаў такія адданыя сваім лецішчам? Чаму нібыта магнітам прыцягваюць іх гэтыя некалькі сотак зямлі? Магчыма, гэта спосаб перамяніць абстаноўку, хоць на выхадныя збегчы ад гарадскога тлуму. А мо толькі імкненне атрымаць прыбытак? Ці адказ трэба шукаць у іншай, не такой прыземленай сферы...

Памятаеце эпізод з аскараноснага фільма Уладзіміра Мяньшова «Масква слязам не верыць», у якім сарамлівае дзяўчо едзе на агледзіны да бацькоў свайго абранніка? Менавіта так, на няўдобіцах, пачыналі сваю эпапею першыя савецкія дачнікі. Са знойдзенага цвіка, з ашчадна назбіраных дошчачак ад розных скрынь. З бясконцага «налівай» за зробленыя вокны, дзверы і іншае. Таму тыя дачныя пабудовы ні ў якое параўнанне з сённяшнімі гмахамі не ідуць, але яны дарагія сэрцу іх уладальнікаў — тут жа ўсё даведзена да ладу ўласнымі рукамі.

А садовы ўчастак, дзе і яблыньцы з грушай, і рэмантантнай маліне — усяму месца знойдзецца! А градкі з першым зяленівам, радыскай ды гурочкамі! Толькі здаецца, што некалькі сотак — гэта не ўчастак. Паспрабуй, навічок, урабі іх — дакладна завохкаеш. Але дачнікі са стажам — народ цягавіты. Раніцой штурмам узяўшы электрычку ці прастаяўшы на адной назе колькі кіламетраў у перапоўненым аўтобусе, яны з паклажай у заплечніку ці на калясцы борздзенька спяшаюцца да сваіх сотак. Працуюць ад відна да цямна, не зважаючы на ціск і радыкуліт. Праполваюць, падкормліваюць, падвязваюць і абразаюць. Словам, не падымаюць галавы ад сваіх градак. Акурат як у тым анекдоце.

— Добры дзень, Іван Іванавіч!

— Выбачайце, жанчына, але я вас не ведаю.

— Дык я ж ваша суседка па дачы!

— Тады павярніцеся да мяне спінай і нагніцеся... Вой, добры дзень, Надзея Паўлаўна!

А вось дзеці, якія калісьці з задавальненнем дапамагалі бацькам, сёння часцяком лічаць, што ўсё гэта не мае сэнсу. Тую ж гародніну можна купіць у бліжэйшай краме, дык навошта «гарбаціцца», каб яе вырасціць? Яны не разумеюць, чаму, пачуўшы пра начныя замаразкі, бацькі зрываюцца з горада, каб накрыць градкі, альбо не спяць усю ноч, перажываючы за лёс расады.

На жаль, адыходзяць у мінулае тыя часы, калі дачныя суседзі былі амаль раднёй. Калі хадзілі да кагосьці «на тэлевізар», каб паглядзець спартыўныя спаборніцтвы. Калі ладзілі бяседы з чаркай уласна зробленай слівовай настойкі і спявалі песні пра Яся, што касіў канюшыну, ды пра вясну на Зарэчнай вуліцы. Зараз новае пакаленне дачнікаў аддае перавагу барбекю побач з англійскім лужком пад грукат апаратуры з кампаніяй, што прыехала з горада. Што тут скажаш: іншыя часы, іншыя песні...

Дача патрэбна для адпачынку — зараз гэтая думка становіцца ўсё больш распаўсюджанай. І ў гэтым ёсць сэнс. Але ці не зашмат у нас адпачынку? Мы шукаем больш лёгкую работу, акружаны рознымі прыстасаваннямі, якія выконваюць за нас хатнія абавязкі. Дзеці, калі вынесуць смецце, дык, лічы, подзвіг здзейснілі.

Беларуская нацыя мае сельскія вытокі, многія — гараджане ўсяго ў першым-другім пакаленні. Таму цяга да чатырох сцен на сваёй зямельцы — яна ў нашых генах. Зразумела, уласную гарадскую кватэру мы таксама любім, але не так шчымліва, як дачны дамок з кустом язміну пад акном.

Праца на зямлі з ўсёй яе немудрагелістасцю, як гэта ні дзіўна, вучыць глыбока мысліць, дапамагае бачыць перспектыву, надае ўпэўненасці. Чалавек ад зямлі, так было заўсёды, лічыўся надзейным і спагадлівым, грунтоўным. Таму, калі ў вас ёсць дача, прывучайце сваіх дачушак-пястушак і сыночкаў-званочкаў працаваць на зямлі. І яны не вырастуць зломкамі і абыякавымі людзьмі...

Хто на мора, хто на Вячу,
Ну а дачнікі — на дачу.
Хто на Вячу — я на дачу,
Веру я ў сваю удачу.

Вы, пэўна, ведаеце песню з такімі словамі. Дык, можа, падзеліцеся думкамі: чым яна вымяраецца — ваша аддача ад дачы?

Валянціна ШЭЛЕГ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Злачынства і пакаранне

Яны ўзялі банкамат, а міліцыя ўзяла іх

Справа аб крадзяжы больш за 300 мільёнаў рублёў з банкамата ў Магілёўскім раёне раскрытая.

Уначы на 23 красавіка ў аграгарадку Усход Магілёўскага раёна абрабавалі банкамат, усталяваны ў мясцовым цэнтры культуры і вольнага часу. Зладзеі выразалі дзірку ў сейфе і скралі 327 мільёнаў рублёў.

Як расказаў журналістам намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці Віктар Давыдзенка, 4-5 чэрвеня ў розных рэгіёнах Беларусі затрымалі двух мужчын, якія падазраюцца ў крадзяжы. Яны арыштаваны, даюць паказанні.

Гэта 44-гадовы жыхар горада Быхава, які нідзе не працаваў і быў раней судзімы, у тым ліку і за крадзеж. А таксама 53-гадовы грамадзянін Арменіі, які жыве ў Грузіі. Мужчыны пазнаёміліся раней, калі грамадзянін Арменіі жыў у Беларусі. Як адзначыў першы намеснік УУС Аляксандр Кавальчук, у расследаванні гэтай справы важную ролю адыграла ўзаемадзеянне праваахоўных органаў Беларусі, Арменіі і Грузіі.

Частку скрадзенага, расказалі праваахоўнікі, удалося вярнуць. Пэўную суму жыхар Быхава выдаткаваў на рамонт свайго дома, а грамадзянін Грузіі, ужо ў валюце, звёз з сабой.

Злачынцы рыхтаваліся зрабіць крадзеж менавіта з банкамата, і яны, безумоўна, мелі для гэтага навыкі. Нібыта ў дэтэктыве, зладзеі ўмела выбралі месца і час, калі адсутнічаў вартаўнік, заклеілі і абрэзалі сігналізацыю і відэаназіранне. Аднак усё ж сістэму аховы ім не ўдалося перахітрыць канчаткова: эксперты сабралі на месцы здарэння доказы, якія немагчыма абвергнуць.

У гэтай справе будзе дадзена таксама прававая ацэнка дзеянням службовых асоб Белаграпрамбанка, якому належаў банкамат, і ўстановы, дзе ён быў усталяваны.

Падобны буйны крадзеж з банкамата ў Магілёўскай вобласці быў учынены каля двух гадоў таму ў Клічаўскім раёне. Зладзеі, якія аказаліся расіянамі, ужо адбываюць тэрмін пакарання. Розныя злачынствы, звязаныя з махлярствам і банкаматамі, як правіла, раскрываюцца, паведаміў Аляксандр Кавальчук. Цяпер, напрыклад, затрыманы жыхары Магілёва, якія дзейнічалі ў Гомелі і Гродне.

Ілона ІВАНОВА.

Адным крыміналам спрабаваў прыкрыць другі

24-гадовы непрацуючы мінчанін абакраў сваю каханую, а потым каб пакрыць нанесеную шкоду пацярпелай пасля таго, як яна звярнулася ў міліцыю і ў дачыненні да яго была заведзена крымінальная справа, пайшоў... на іншае злачынства.

— Малады чалавек пазнаёміўся праз інтэрнэт з дзяўчынай. Неўзабаве яны вырашылі пажыць разам — у яе кватэры. Праз нейкі час дзяўчына заўважыла прапажу пярсцёнкаў, бранзалетаў і завушніц. Паколькі малады чалавек на тэлефонныя званкі не адказваў, дзяўчына звярнулася ў міліцыю. Праваахоўнікі ўстанавілі асобу злымысніка. Затрыманы прызнаўся, што шэсць залатых упрыгажэнняў прадаў незнаёмцу за 5 мільёнаў рублёў, а грошы прайграў у казіно. У дачыненні да падазраванага завялі крымінальную справу, і ён вырашыў пакрыць пацярпелай нанесеную шкоду, — паведаміла прэс-сакратар Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга Куцько. — На адным з сайтаў малады чалавек размясціў аб'яву аб продажы мабільнага тэлефона. Ва ўмовах патрабаваў перадаплату, а тэлефон абяцаў даставіць цягам пяці дзён. Кліент, зацікаўлены таннай цаной, знайшоўся хутка. Пры сустрэчы з 31-гадовым мінчанінам хлопец паказаў свой пашпарт, узяў грошы і паабяцаў, што хутка даставіць тэлефон. Праз пяць дзён пакупнік пачаў званіць прадаўцу, але той на званкі не адказваў. Кліент звярнуўся ў міліцыю. Падчас праведзенай праверкі міліцыянеры і высветлілі, што «прадавец» мабільнага тэлефона і падазраваны ў крадзяжы з кватэры дзяўчыны каштоўнасцяў — адна і тая ж асоба. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку зноў затрымалі зламысніка. У праваахоўнікаў ёсць падставы меркаваць, што на «тэлефонную вуду» зламысніка маглі трапіць і іншыя занадта даверлівыя грамадзяне.

Са злосці пабіў каменем і сваю машыну

Пасля застолля неаднаразова судзімы 30-гадовы мінчанін вырашыў падыхаць свежым паветрам. На прагулку выйшаў у свой дворык па вуліцы Каржанеўскага.

Раптам раздаўся гук спрацаваўшай аўтамабільнай сігналізацыі. Ён настолькі не спадабаўся мужчыну, што той, схапіўшы камень, пачаў ім стукаць па іншамарцы. Зламаўшы бакавыя люстэркі і пакінуўшы на кузаве шмат увагнутасцяў, дэбашыр пераключыўся на другі аўтамабіль. Яго спынілі знаёмыя, што выбеглі на шум, а пасля буяна затрымалі супрацоўнікі Кастрычніцкага РУУС. Калі грамадзянін ачомаўся, высветлілася, што адна з пашкоджаных іншамарак — яго ўласны аўтамабіль. Матэрыялы перададзены ў раённы следчы камітэт для дачы прававой ацэнкі.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Пішыце рукамі

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА НЕ БУДЗЕ ДЛЯ КАМП'ЮТАРА ЧУЖЫМ?

Як было б добра: робіш нейкія нататкі ад рукі, а яны адразу пераўтвараюцца ў электронны фармат. Не трэба ніякай клавіятуры. Проста пішаш, як звычайна, — і ўсё. Тэхналогіі, якія дазваляюць гэта рабіць, ужо існуюць. Зразумела, што ў першую чаргу такое было зроблена для англійскай і іншых моў з лацінскім алфавітам. Але прыйшла чарга і беларускай.

Ліліян Саван, спецыяліст французскай кампаніі VisionObjects, якая спецыялізуецца на распазнаванні рукапісных тэкстаў, днямі пабываў у Беларусі, каб атрымаць як мага больш узораў почыркаў беларусаў. Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны стала партнёрам гэтай ініцыятывы і дапамагло ў яе ажыццяўленні. Тры дні ў офіс Таварыства прыходзілі людзі, неабыякавыя да роднага слова. Яны запаўнялі спецыяльныя анкеты на беларускай мове лічбавымі асадкамі, якія запаміналі почырк кожнага ўдзельніка. Усё гэта рабілася для таго, каб работнікі VisionObjects маглі пачаць працу па распазнаванні камп'ютарам і беларускай рукапіснай мовы. «Мэта праекта — сабраць прыклады почыркаў як мага большай колькасці людзей: мужчын і жанчын, старых і маладых. Пры дапамозе лічбавых асадак запісваецца працэс напісання літар, лічбаў і іншых знакаў ад кожнага ўдзельніка», — распавядае Ліліян Саван.

Падобная праца праводзіцца кампаніяй па ўсім свеце: «Мы працуем не толькі з Беларуссю. Гэта і англійская, і японская, і мангольская, і шмат іншых моў. Нам асабліва цікава працаваць з мовамі, якія не маюць шырокага распаўсюду, каб захаваць іх. Такой з'яўляецца і беларуская. Мая праца заключаецца ў тым, што я павінен вандраваць па свеце і прасіць людзей пісаць», — прызнаецца спецыяліст.

Дарэчы, спадар Ліліян лічыць, што будучыня не толькі за лічбавымі формамі захавання інфармацыі: «Рукапісы будуць існаваць таксама. Сёння, зразумела, людзі ўсё больш карыстаюцца планшэтамі, смартфонамі і іншай тэхнікай. Але ўсе гэтыя прыстасаванні маюць пэўныя абмежаванні. Вы заўсёды маеце патрэбу ў напісанні чаго-небудзь. З дапамогай ручкі, пальца, алоўка. І часам бывае, што напісаць нешта рукой значна прасцей і хутчэй, чым з дапамогай нейкіх тэхнічных прыстасаванняў. Аднак пасля гэтага часта даводзіцца пераводзіць усё ў лічбавы фармат з дапамогай камп'ютараў. Мы працуем для таго, каб чалавек мог пісаць сваёй рукой, як звычайна, а спецыяльная праграма адразу пераводзіла б гэта ў патрэбны фармат. Гэта вельмі эканоміць час. Такія магчымасці будуць вельмі карыснымі для адукацыі». І сапраўды: замест таго, каб дзецям парушаць сваю маторыку на клавіятуры, лепей яны будуць пісаць, як на звычайнай паперы, а потым тэкст будзе пераводзіцца ў электронны выгляд.

Хочацца таксама спадзявацца, што ўсё гэта — першая прыступка на шляху да таго, што і беларуская мова будзе даступнай для карыстання ў найноўшай тэхніцы. Але праца яшчэ далёка не завершана. Адбыўся толькі пачатковы этап. Праект не абмежаваны па часе, ён перманентны: чым больш будзе ўдзельнікаў, тым больш якасным будзе распазнанне рукапісаў. Напэўна, у многіх беларусаў яшчэ з'явіцца магчымасць пакінуць у гісторыі сваё ўласнае беларускае слова для карысці мовы і нацыі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

«2» ЗА СУМЛЕННАСЦЬ

Полацкім міжраённым аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь у дачыненні да начальніка аддзела адукацыі Полацкага райвыканкама распачата крымінальная справа.

Інкрымінуецца злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі ў пытанні распараджэння дзяржаўным жыллёвым фондам.

— Полацкім міжраённым камітэтам дзяржаўнага кантролю падчас праверкі працы аддзела адукацыі Полацкага райвыканкама па пытаннях распараджэння дзяржаўным жыллёвым фондам было ўстаноўлена, што начальнікам аддзела адукацыі ў 2011 годзе былі дадзены незаконныя ўказанні падначаленым работнікам аб заключэнні дагавора найму жылога дома ў вёсцы Двор Гомель (агульнай плошчай 41,2 кв. м) паміж Гомельскай дзіцячай базавай садам-школай і адным з бацькоў. Летась былі прынятыя меры да пераводу дома ў асабістую ўласнасць шляхам прыватызацыі на імя бацькі, — паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. — На момант заключэння дагавора найму мужчына не з'яўляўся работнікам гэтай установы адукацыі і не знаходзіўся на ўліку ў якасці таго, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У яго ўласнасці знаходзілася кватэра ў Полацкім раёне. Пры гэтым у Гомельскім сельвыканкаме па месцы знаходжання жылога дома ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў стаіць 13 грамадзян, 3 з якіх прэтэндавалі на прадастаўленне ім жылых памяшканняў. Але ім гэты дом не быў прапанаваны для засялення...

Як устанавілі рэвізоры, дом быў адчужаны па заніжаным кошце, чым была нанесена шкода дзяржаве на суму 29,5 мільёна рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Простыя рэчы

ПРАНІК

Гэтае слова, як каменьчык, ляжыць на фанетычнай мяжы рускай і беларускай моў.

Беларусы-вяскоўцы, якія пачынаюць гаварыць «па-гарадскому», «пранікам» называюць прывезены з Тулы «пряник». Што гэта пернік, яны забыліся, а вымавіць слова «пряник» не могуць, бо, як казалі ў нашай вёсцы, язык трэба ламаць. А тым, хто моцным урадзіўся, з трывушчымі падмуркавымі генамі, гэта аніяк не ўдаецца нават за цэлае жыццё. Бо ламаць жа язык трэба не ў роце, а ў свядомасці.

Але дзіўна было б, калі б які-небудзь туляк, едучы да нас на госці, у якасці падарунка прыхапіў з сабой валёк. Бо нашы вясковыя майстры выштукоўвалі дужа зручныя пранікі — дакладна разлічанага цяжару, з ёмкім — так і просіцца ў абшчэп — дзяржаннем...

Цяпер пранік — архаічная рэч, знойдзеш яе хіба што ў этнаграфічным музеі ці трапіцца пад руку сярод непатрэбшчыны на якім гарышчы або ў цёмнай каморы старой хаты. Вырак забыцця праніку быў прадвызначаны вясковым паходжаннем, яго непадатлівасцю хоць якому малому ўплыву навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Ну падумайце самі: звычайны цурбачок, толькі што добра абструганы, зверху трохі падчасаны з абодвух бакоў так, што ў мініяцюры нагадвае сцірту ці нястромкі, пакаты дах доўгай пабудовы. Дзяржанне не прымацавана, а вычасана разам з асновай праніка з адной суцэльнай дзеравякі.

Вясковая прылада працы, ды яшчэ жаночая, дапатопная... А я вось пішу пра яе з задавальненнем. Можа, таму, што не ў музеі яе ўгледзеў, а збярог у кладовачцы сваёй хлапчукоўскай памяці.

Мама мела не адзін пранік, а пару — на змену, ці што, а можа, на выпадак, калі расшчэпіцца перасохлы цурбачок.

Пранікам рабілі простую, зусім не захапляльную работу. Найперш, з яго дапамогай мылі апранахі. Напоўніць каторая кабета спадніцамі, штанамі, кашулямі ды сваімі куртамі поўны тазік — пад руку яго, а ў другую — пранік, і на рэчку або сажалку.

А далей яшчэ прасцей. Ва ўтульным куточку на бережку бярэцца з тазіка якая-небудзь апранаха, на пакладзенай у ваду дошчачцы старанна намыльваецца бруском гаспадарчага мыла, складваецца ў колькі столак і на той жа дошцы абгрукваецца з усіх бакоў важкім пранікам. Такім чынам з густога сіта тканіны выбіваецца бруд і пыл, якіх у вясковай вопратцы амаль столькі ж, колькі і ў шахцёрскай.

Пральных машын тады ў нас яшчэ не было.

Аднойчы ўвесну матуля прыладзілася мыць бялізну ў ручаіне акурат каля самай хаты, непадалёк ад мастка. Вада тут трохі глыбейшая, ручаіна падаецца ўшыркі... Я, цікаўны хлапчук, круціўся побач, забаўляўся ды назіраў за маці. І нездарма! Як толькі яна скалыхнула паверхню, загрукала пранікам, вада нібы абудзілася, здавалася, самачынным плёскатам, частым і гучным, які ўспыхваў, нібы полымя, то на адным бережку калюжыны, то на другім. Гэта быў шчупачок, які, зрушаны з возера нераставым свярбеннем, даплыў па ручаіне аж да самай вёскі.

Як на тое, уздоўж ручаіны вяртаўся з рыбацкага паходу сусед Іван Міронаў з восцямі. Ішоў упустую, не ўскалоўшы на свой «відэлец» ніводнай рыбіны. Дык, натуральна, як толькі ён убачыў, што маці ўпудзіла шчупака і той, абеламучаны, ніяк не здагадваецца сігануць уздоўж рэчышча, а мітусіцца на адным месцы, тут жа, узняўшы восці напагатоўку, подбегам кінуўся да вады. І здабыў азёрнага прыблуду з першага ўдару. А потым зняў рыбіну з вострага зуба і аддаў маці: маўляў, твая здабыча, ты ж яе «выбіла» з вады сваім ёмкім пранікам...

...Жнівеньскі сонечны дзянёк. Пад калгаснай шахой расстаўлены высокія, амаль упоравень з маім хлапчукоўскім ростам, грубасткія калоды. Заставалася толькі здагадвацца, дзе адшукаліся такія магутныя дрэвы. Каля калод у шчыльных цыратовых фартухах з пранікамі ў руках завіхаюцца нашы вясковыя бабы — маці, бабулі, іншая радня, да якой сёння я прылічваю і ўсіх колішніх суседак. Бабы выцягвалі з вялізных куч звезеныя пад шаху снапы выцераблена льну і, падтрымліваючы рукой камлі, клалі іх на калоды ды браліся за пранікі: старанна абгруквалі імі верх снапа, абіваючы, расплюшчваючы ўсе да адной галоўкі з ільнасемем. Шалупінне разам з семем ляцела долу, а калі не, дык калгасніцы змяталі абабітае з калоды тым жа снапом або рукамі, каб потым знесці ў агульную кучу на абмалот камбайнам. Звычайным, якім убіралі збажыну, праўда, спецыяльна абладжаным: камбайнер здымаў матавіла, нож, рэгуляваў прамежак паміж сітамі і пругкасць павеву вентылятара.

Ільноўборачных камбайнаў у нас тады яшчэ не было.

Ababітыя пранікамі снапы жанчыны выносілі з-пад шахі на двор і складвалі ў асобныя кучы — кожная ў сваю, каб рахункавод падлічыў, колькі хто напрацаваў за дзень. Улік вёўся старажытнай мерай колькасці — копамі. Некаторыя руплівіцы ababівалі за дзень па сем, а то і болей коп.

...Маленькі, я стаяў, прыхінуўшыся спінай да цёплага слупа апоры шахі і не ведаў, у што ўслухвацца — у перазовы пранікаў, у іх ірваны, такі адвольны і, здавалася, такі суладны рытм — быццам музыкі-віртуозы сімфанічнага аркестра б'юць у свае, падобныя на вялізныя саганы, бубны, ці ў рознагалоссе суседак, мамы Ірыны, бабулі Праскоўі, хроснай маці Просі, у рэй, які вялі сваімі «яркастымі» галасамі руплівіца Рэнька, Тося ды вясковая пяюха Сцеша...

Немагчыма было што-небудзь вылучыць з гэтага перакручанага, нібы вязьмо, шчыльнага гукавага суплёту. Цяпер, пасля столькіх дзесяцігоддзяў, той пошчак пранікаў, мне здаецца, зменлівым рытмам рэгтайма, а галасы дарагіх сэрцу жанчын — нязмушаным рэчытатывам па ўслаўленні жыцця. Усё гэта шчаслівым успамінам назаўсёды запала ў душу.

Гэтыя зусім неацішаныя пражытымі гадамі галасы і гукі якраз і натхнілі мяне на расповед аб праніку. І вось моўным кружляннем я, натхнёны, вярнуўся да пачатку задумы.

Расповед быў бы няпоўным, каб я не згадаў, як маці абівала пранікам кмен, які яна збірала з вялікай ахвотай і шмат, каб было ўдосталь сабе і суседзям на восень, зіму і вясну, да наступнай спеласці. Маці збівала вырваныя або скошаныя сцябліны ў снапы, а тады падвешвала іх дзе-небудзь у пуні ці пад страхой падсохнуць. Пасля чаго рассцілала на калодцы светлую хусцінку і лёгенька ababівала на яе пранікам духмянае насенне.

Пранік дапамагаў нам пачуваць сябе сапраўднымі беларусамі, якія не проста любяць бульбу, але абавяз-

кова звараную са шчодрай кменавай прысыпкай.

І, нарэшце, аб адмысловым доўгім праніку, якім жанчынкі качалі, каб выпрасталася, памытую бялізну. Калі паглядзець збоку, ён нагадвае пілу з выразнымі, хоць і з прытупленымі дзюбкамі, зубчыкамі. А зверху, калі пранік перавярнуць, зубчыкі выглядалі, як вузенькія баразёнкі ці нарэзаныя пад барышное гранкі. Яны рабіліся для таго, каб пранік лаўчэй зачэпліваўся за бялізну.

Залубянелую мужаву сподню кашулю разам з іншым намытым адзенню маладзенькая гаспадынька ўносіла ў хату з двара, дзе высушвала на марозе. Клала на лаву, каб адышла і набыла звыклую мяккасць, падсушвала каля нацепленай грубкі, але не канчаткова. Потым брала трошкі вільготную кашульку, накручвала на даволі доўгую і куды таўсцейшую, чым таўкач, адмысловую качалку і качала яе пранікам на складзеным на стале ў колькі столак абрусе — сюды-туды, сюды-туды... На кашулі распраўляліся зморшчыны, пакой напаўняўся пахам марознай свежасці, а душа — п'янкім прадчуваннем вечаровых любошчаў з мужам.

Свет напаўняўся чысцінёй, якая зусім не зманліва абяцала вечнае жыццё.

А электрычных прасаў тады ў нас яшчэ не было.

Яно і добра, бо маці лёгка прапаліла б дзірку ў маёй памяці.

Сяргей РУБЛЕЎСКІ

■

Кулінарная Энцыклапедыя Мікалая Нікіфароўскага

СВОЙ СВАЙГО ПАЗНАЎ І НА ПІВА ПАЗВАЎ

Туман плыве з нізіны сівы
Над нівай голай і пустой.
«Глядзіце, заяц варыць піва»,—
Жартуюць людзі між сабой.
А я відушчым бачу зрокам,
Як ён прысеў каля агню,
Трыгубы, шэры, касавокі,
І піва варыць з ячменю.

У. Караткевіч

Сыроватка заўсёды лічылася ласым асвяжальным і карысным напоем, але звычайна яе зберагалі для прыгатавання кіслых страў. Дастаткова рэдкімі былі і кіслыя расолы: бурачны, капусны, агурэчны. Іх ужывалі пасля перапою або пры некаторых страўнікавых захворваннях, таму, лічыць Нікіфароўскі, іх можна аднесці да лекавых.

Асобнай размовы заслугоўвае піва. Гэты напой быў вядомы яшчэ ў III тысячагоддзі да н. э. У Вавілоне, дзе ва ўжыванні было 19 гатункаў піва, дзейнасць півавараў рэгулявалася законамі Хамурапі, згодна з якімі павышэнне кошту піва каралася смерцю. Падчас археалагічных раскопак у Егіпце быў знойдзены самы старажытны рэцэпт прыгатавання піва. З цягам часу яно стала вядома і ў Еўропе. У старажытных літоўцаў і беларусаў піва было абрадавым напоем. Ёсць мноства гатункаў гэтага папулярнага пітва, але ў большасці з іх прысутнічаюць чатыры асноўныя складнікі: ячмень, хмель, вада і дрожджы. У сярэдзіне XIX стагоддзя на Віцебшчыне яшчэ захавалася ва ўжыванні «простае» ячменнае піва, якое рабілася на піваварaных заводах або хатнімі сродкамі да восеньскіх і зімовых свят. Панскія маёнткі звычайна мелі ўласныя піваварні. Часта піва варылася некалькімі сем'ямі ў вялізных катлах. Па часе ўжывання яно называлася «пакроўскім, змітраўскім, міхайлаўскім, мікольскім». Нярэдка матэрыял для прыгатавання піва збіраўся вяскоўцамі ў складчыну і здаваўся на бліжэйшую піваварню, а адтуль яны атрымлівалі гатовы прадукт, які дзялілі прапарцыйна зданаму ячменю. Мікалай Якаўлевіч піша, што хатняе піваварэнне яму прыходзілася назіраць зімой 1853—1854 года ў Пухнове і Баранаве Веліжскага павета, а праз 15 гадоў ён бачыў закрыццё піваварaных заводаў у сяле Лоўжа і мястэчку Сіроціна Полацкага павета.

Піва, пра якое ішла размова вышэй, магло быць толькі святочным і гасцінным пітвом. Яно заслугоўвае пахвалы, таму што не дурманіла галавы, а было прыемным, ласым і здаровым напоем. Нездарма яго называлі «вадкім хлебам». Такім жа заставалася яно і пры ўжыванні ў «цюпках» ці пры «сухамятцы».

Як старэйшы брат «простага» піва, было вядома піва «марцо́вае» (вытрыманы, стары напой). Акрамя густаты, больш цёмнага колеру і некаторай саладкаватасці, гэтае піва яшчэ больш пенілася, а пры бутэлечным захоўванні давала шмат газаў.

Адам Багдановіч успамінае: «Да гэтага часу не магу забыць цудоўнага чарэйскага (зараз вёска Чарэя Чашніцкага раёна Віцебскай вобл. — **А. В.**) піва, пеністага, іскрыстага, смачнага, так прыемна казытаўшага паднябенне, і хмельнага, але прыемна асвяжаючага мёду, які надаваў весялосці, але не дурманіў галавы».

Нікіфароўскі піша, што з правядзеннем жалезнай дарогі ў 1866 годзе «простае» піва пачало замяняцца «бава́ровым» (баварскім) спачатку ў месцах бліз чыгункі, а потым трапіла і ў аддаленыя вёскі Віцебскай губерні. Адным з варыянтаў гэтага піва было так званае «чорнае», дастаткова папулярнае ў спажыўцоў.

А вы ведаеце, шаноўныя чытачы, чым багі Алімпа падтрымлівалі сваю вечную маладосць і неўміручасць? Адказ на гэтае пытанне даў геніяльны Гамер. Ён піша, што гэтаму спрыялі амброзія — ежа багоў і духмяныя прыцяранні, а таксама нектар — пітво алімпійцаў. А што такое нектар? Гэта салодкі сок, які выдзяляецца кветкамі меданосных раслін. Яго збіраюць пчолы і перапрацоўваюць у мёд. Такім чынам, мёд — гэта сакральны напой, які ва ўяўленнях старажытных індаеўрапейцаў звязваўся з тым светам, неўміручасцю, мудрасцю і красамоўем. Мядовыя напоі былі вядомы з сівой даўніны і сустракаліся ў большасці старажытных народаў Еўропы: грэкаў, славян, літоўцаў, скандынаваў, германцаў, піктаў і іншых. Як тут не прыгадаць цудоўны верш «Верасовы мёд» Стывенсана або рускія былiны! Дык вось, каб вы ведалі, шаноўныя чытачы: князь Уладзімір і Усяслаў Чарадзей са сваімі дружынамі пілі «стаўлены мёд». Для яго прыгатавання бралі 2/3 свежага мёду і 1/3 соку ягад брусніц, вішні або маліны (і ніякай вады!). Сумесь налівалі ў вялізныя чаны, чакалі натуральнага збраджвання і шматкратна пералівалі. Потым вадкасць залівалі ў засмоленыя бочкі і на працяглы тэрмін (ад 15—20 да 40 гадоў) закопвалі ў зямлю. Толькі тады атрымліваўся сапраўдны мёд, годны княжага стала. З цягам часу для павелічэння моцы напою і скарачэння тэрмінаў вытрымкі ў прыгатаванні мёду пачалі выкарыстоўваць хмель або варыць яго па тэхналогіі вырабу піва. У XVI стагоддзі мёд пачала выцясняць гарэлка. «Мядкі» і «медавухі», якія з'явіліся ў XVI-XVII стагоддзях і дайшлі да нашых дзён, не маюць амаль нічога агульнага з класічнымі мядовымі напоямі. Пры іх прыгатаванні невялікая колькасць мёду разводзіцца ў вадзе і потым у атрыманую сумесь дадаецца алкаголь. Наогул, цікава прасачыць за гістарычным развіццём пэўных напояў. Напрыклад, піва: абрадавы напой — святочны напой — паўсядзённы напой. Займальным падаецца і адваротны лінгвістычна-тлумачальны ланцужок: піва — піць — пір. Мёд: сакральны напой — абрадавы напой — святочны напой — эрзац.

Старажытным літоўцам, з якімі нас звязваюць агульныя культурныя і гістарычныя карані, таксама было вядома алкагольнае пітво. Галоўным было піва, але існавалі і іншыя напоі. Вось што піша І. П. Барычэўскі ў артыкуле «Звесткі аб старажытных літоўцах»: «Са старажытных часоў літоўцы ўмелі прыгатаваць мёд накшталт салодкага піва — *алюс*. Вельмі хутка ап'яняючы мёд называўся *паскайлес*. Ужывалі малако кабыл з цёплай крывёй жывёл, ад якога яно хутка закісала і атрымлівала мацунак. Гэты напой можна было піць толькі пасля яго асвячэння. Усе напоі для густу запраўлялі пахкай травой».

Але ніводзін з папярэдніх напояў не меў у простага люду такой папулярнасці, як гарэлка. Чаго варты адны яе назвы: «вадзіца аржана́я», «вадзіца святая», «аржану́шка», «по́сніца», «весялу́шка», «гаркуша́», «забяру́шка», «акаянніца» і інш. Для варыянтаў ужывання гарэлкі таксама было знойдзена шмат трапных слоў і выразаў: «хапіць», «пірак і́нуць», «забіць му́шынку», «закінуць у шулумейку», «свіснуць», «дзёрнуць», «дзірбалы́знуць», «скыва́ць шыла» і інш. Чаму прыдумана столькі іншасказальных, «атумечных» назваў гарэлкі і варыянтаў яе ўжывання? Мабыць, таму, што ў шматлікіх казках і паданнях аб гарэлцы падкрэсліваецца яе сатанінскае паходжанне, і людзі адчувалі нейкі грэх пры ўжыванні гэтага напою. Напрыклад, у казцы «Ліхая выдумка» Люцыпар адпраўляе чорта дапамагчы мужыку Сідару, у якога той некалі ўкраў апошні акраец хлеба. З такім работнікам Сідар за два сезоны атрымаў небывалы ўраджай жыта. Чорт угаварыў мужыка зварыць спачатку моцнае піва, а потым, перагнаўшы яго, атрымаў «гаркуху». Ён жа навучыў Сідара і яго аднавяскоўцаў піць гарэлку, бо што за чорт без благой справы! І пайшла яна, акаянная, гуляць па свеце.

Даследчыкі выводзяць назву гэтага моцнага напою, сумесі рэктыфікаванага этылавага спірту са змякчанай вадой, ад калькі з нямецкага Geprant Wein (гарэлае віно), але для беларусаў гарэлка заўсёды асацыявалася са словамі «горкі», «гаркуха» (па смакавых уласцівасцях) і «гарэць», «гар» (таму што моцная гарэлка гарыць). У жыхароў Віцебшчыны, якія знаходзіліся пад больш значным расійскім уплывам, замацавалася назва «водка». Пра гэты напой існуе мноства міфаў, паданняў і гістарычных спрэчак, але пра гэта ў наступным артыкуле.

Аляксандр ВАШЧАНКА.

А зараз рэцэпт пад назвай «медавуха веснавая»

Нам спатрэбіцца: *0,5 л мёду, 3 л бяроставіку, 1 луста чорнага ржанога хлеба, 30 г піўных дражджэй.*

Прыгатаванне: у гліняны гаршчок, устойлівы посуд пакласці мёд, наліць бярозавік, паставіць на агонь, памешваючы, давесці да кіпення, паменшыць агонь і варыць яшчэ гадзіну. Астудзіць, у цёплую вадкасць пакласці лусту намазанага дражджамі хлеба і пакінуць на суткі ў цёплым памяшканні. Калі мёд пачне «хадзіць», хлеб дастаць, накрыць посуд рушніком і трымаць у цёплым памяшканні да тае пары, пакуль не закончыцца працэс браджэння. Затым разліць мёд у бутэлькі, закаркаваць і пад вуглом 30—40° паставіць у пограб або халадзільнік. Напой будзе гатовы праз тры месяцы.

Геральдычная калекцыя

Вядучы рубрыкі
Уладзімір Крукоўскі

Гонар радаводу
Беларускія шляхецкія гербы

РУКА

У чырвоным полі рука ў блакітным даспеху трымае тры чорныя стралы вастрыямі ўніз.

Гербакарыстальнікі: Чурскі, Шчурскі.

РЫХТАР

Шчыт падзелены залатым пасам наўкос справа налева. У верхняй блакітнай палове — паўваленя натуральнага колеру, у ніжняй, чорнай — тры белыя ружы трохкутнікам.

Гербакарыстальнік Рыхтар.

СВЕНЧЫЦ

У залатым полі сярэбраны шасціканцовы крыж.

Гербакарыстальнікі: Ганусоўскі, Губінскі, Зампшыц, Карчэўскі, Кражоўскі, Крыжэвіч, Маеўскі, Палянскі, Пацалаеўскі, Пласевіч, Пляшевіч, Радзішэўскі, Ражанскі, Хмара, Шастакоўскі.

СВЯТАПОЛК-МІРСКІХ (уласны)

У блакітным полі чорная падкова гакамі ўніз. У ёй — сярэбраная куля з залатымі апаскамі. За куляй — сярэбраная страла з расшчэпленым канцом вастрыём уверх.

Гербакарыстальнік Святаполк-Мірскі.

УВАГА! ПАДАЁМ ДАКУМЕНТЫ Ў АСПІРАНТУРУ

Учреждение образования
«Белорусский государственный экономический университет»
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ на 2013 год
по следующим отраслям наук
и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе:

АСПИРАНТУРА*

	Дневная форма обучения	Заочная форма обучения	Соиска-тельство
05.00.00 – Технические науки	**1**	**-**	**-**
05.19.08 – товароведение, экспертиза и безопасность непродовольственных товаров и сырьевых материалов	1	-	-
08.00.00 – Экономические науки	**24**	**10**	**1**
08.00.01 – экономическая теория	2	-	-
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством	15	5	-
08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит	2	1	-
08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика	1	1	1
08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики	1	2	-
08.00.14 – мировая экономика	3	1	-
12.00.00 – Юридические науки	**2**	**2**	
12.00.02 – конституционное право; конституционный процесс; муниципальное право	1	1	-
12.00.03 – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право	2	2	-
12.00.05 – трудовое право, право социального обеспечения	1	1	1
12.00.14 – административное право, административный процесс	1	-	-
23.00.00 – Политические науки	**-**	**-**	
23.00.01 – теория и философия политики, история и методология политической науки	-	-	-
23.00.02 – политические институты, процессы и технологии	-	-	-
23.00.04 – политические проблемы международных отношений глобального и регионального развития	-	-	-

**Указано количество мест для обучения за счет средств республиканского бюджета.*

Обучение в аспирантуре осуществляется: по дневной форме — 3 года, по заочной форме — 4 года, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в дневную и заочную аспирантуру должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

ДОКТОРАНТУРА*

	Дневная форма обучения	Соиска-тельство
08.00.00 – Экономические науки	**2**	**3**
08.00.01 – экономическая теория	2	2
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством	-	1
08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит	-	-
08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика	-	-
08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики	-	-
08.00.14 – мировая экономика	-	-

**Указано количество мест для обучения за счет средств республиканского бюджета*

Обучение в докторантуре осуществляется: по дневной форме — 3 года, в форме соискательства — до 5 лет.

Прием лиц для получения послевузовского образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь № 561 от 01.12. 2011 г.).

Лица, поступающие в аспирантуру и докторантуру, предварительно проходят собеседование на профильных кафедрах.

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

Зачисление в аспирантуру и докторантуру — **1 ноября 2013 г.**

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру обращаться:
220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 26, учебный корпус 6, комн. 17

Тел.: **(+375 17) 209-78-85**

E-mail: **aspirantura@bseu.by**

Прием документов в аспирантуру и докторантуру
с 1 августа по 30 сентября 2013 г.

Время работы приемной комиссии:
с **9.00** до **17.00**, перерыв на обед: с **13.00** до **14.00**.

Проезд: тролл. **3, 15, 16, 17, 34, 41,** авт. **59, 79, 93** до ост. «Площадь Ванеева».

УНП 100015608

УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины»
ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС В ДОКТОРАНТУРУ, АСПИРАНТУРУ И МАГИСТРАТУРУ НА БЮДЖЕТНУЮ И ПЛАТНУЮ ФОРМЫ ОБУЧЕНИЯ НА 2013 ГОД:

В АСПИРАНТУРУ по специальностям: биохимия (1 – очно); паразитология (1 – заочно); диагностика болезней и терапия животных, патология, онкология и морфология животных (2 – очно); ветеринарная микробиология, вирусология, эпизоотология, микология с микотоксикологией и иммунология (1 – очно); ветеринарная хирургия (2 – очно); ветеринарное акушерство и биотехника репродукции животных (2 – заочно).

В ДОКТОРАНТУРУ по специальностям: диагностика болезней и терапия животных, патология, онкология и морфология животных (1-соискательство); частная зоотехния, технология производства продуктов животноводства (1 – очно).

В МАГИСТРАТУРУ по специальностям: «Ветеринария» (8 – очно, бюджет, 4 – заочно, бюджет, 2 – очно, платная основа, 4 – заочно, платная основа) и «Зоотехния» (3 – очно, 2 – заочно).

Прием документов в аспирантуру и докторантуру осуществляется **с 1 августа по 30 сентября 2013 г.**
Прием в аспирантуру осуществляется на конкурсной основе **с 1 по 31 октября 2013 г.**
Прием документов при поступлении в магистратуру **с 18 по 24 августа 2013 г.**
Вступительные экзамены – **с 25 по 30 августа 2013 г.**
Документы направлять по адресу:
210026, г. Витебск, ул. 1-я Доватора, 7/11, научный отдел.
Справки по телефону: 37-04-42.

УНП 300002681

Палескі дзяржаўны ўніверсітэт
ПРАВОДЗІЦЬ ПРЫЁМ У ВОЧНУЮ АСПІРАНТУРУ
па спецыяльнасцях:

08.00.05 — эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай — 2 чалавекі;
08.00.10 — фінансы, грашовае абарачэнне і крэдыт — 1 чалавек;
13.00.04 — тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўляльнай і адаптыўнай фізічнай культуры — 1 чалавек;
03.01.06 — біятэхналогія — 1 чалавек;
у вочную дактарантуру па спецыяльнасці 13.00.04 — тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўляльнай і адаптыўнай фізічнай культуры — 1 чалавек.

Прыём дакументаў па адрасе: **225710, г. Пінск, вул. Пушкіна, 4, тэл. (0165) 31 08 56.**
Падрабязная інфармацыя — на сайце: **http://www.psunbrb.by.**

УНП 290473286

УО «Белорусский государственный университет транспорта»
объявляет прием на первую ступень послевузовского образования (аспирантуру) на 2013 год

На дневную форму послевузовского образования по специальностям:		
Шифр	**Специальность**	**План приема**
01.02.04	Механика деформируемого твердого тела	1
01.02.06	Динамика, прочность машин, приборов и аппаратуры	1
05.16.09	Материаловедение (машиностроение)	2
05.22.08	Управление процессами перевозок	1
На заочную форму послевузовского образования по специальности:		
Шифр	**Специальность**	**План приема**
05.22.08	Управление процессами перевозок	1
05.23.01	Строительные конструкции, здания и сооружения	1
08.00.05	Экономика и управление народным хозяйством	1
По форме соискательства по специальности:		
Шифр	**Специальность**	**План приема**
05.16.09	Материаловедение (машиностроение)	1
08.00.05	Экономика и управление народным хозяйством	1

Подготовка ведется не только за счет бюджетных средств, но и на условиях оплаты за обучение.
Прием документов с 28 августа по 30 сентября 2013 г. по адресу: 246022, г. Гомель, ул. Кирова, 34, каб. 272.
Справки по телефону: (8 0232) 95 34 95.

УНП 400057727

Учреждение образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины»
ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР ЛИЦ НА 2013 ГОД
для получения послевузовского образования I ступени (аспирантура) и II ступени (докторантура) за счет средств республиканского бюджета

Отрасль науки (шифр и название)	Шифр и название специальности	Аспирантура				Докторантура		
		Всего	Из них по форме обучения (количество мест по плану)			Всего	Из них по форме обучения (количество мест по плану)	
			Дневная	Заочная	Соискательство		Дневная	Соискательство
01.00.00 – физико-математические науки	01.01.06 – «Математическая логика, алгебра и теория чисел»	**0**	0	0	0	1	1	0
	01.04.07 – «Физика конденсированного состояния»	**1**	1	0	0	0	0	0
		2	1	0	0	0	0	0
			0	1	0	0	0	0
03.00.00 – биологические науки	03.03.01 – «Физиология»	**1**	1	0	0	0	0	0
05.00.00 – технические науки	05.13.18 – «Математическое моделирование, численные методы и комплексы программ»	**1**	0	1	0	0	0	0
08.00.00 – экономические науки	08.00.01 – «Экономическая теория»	**1**	1	0	0	0	0	0
10.00.00 – филологические науки	10.01.02 – «Русская литература»	**1**	1	0	0	0	0	0
	10.02.01 – «Белорусский язык»	**1**	1	0	0	0	0	0
12.00.00 – юридические науки	12.00.08 – «Уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право»	**1**	1	0	0	0	0	0
13.00.00 – педагогические науки	13.00.01 – «Общая педагогика, история педагогики и образования»	**1**	0	1	0	0	0	0
	13.00.04 – «Теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры»	**4**	1	0	0	0	0	0
			1	0	0	0	0	0
			0	1	1	0	0	0
19.00.00 – психологические науки	19.00.05 – «Социальная психология»	**2**	2	0	0	0	0	0
	19.00.07 – «Педагогическая психология»	**1**	1	0	0	0	0	0
25.00.00 – науки о земле	25.03.01 – «Физическая география и биогеография, география почв и геохимия ландшафтов»	**1**	**1**	**0**	**0**	**0**	**0**	**0**
Итого		**18**	**13**	**4**	**1**	**1**	**1**	**0**

Подробную информацию можно узнать по тел. **8 (0232) 578377** или на сайте университета **gsu.by**

УНП 400011099

БІТВА КАЛЯ СІНЯЙ ВАДЫ

Мал. Міколы КУПАВЫ.

Адным з галоўных кірункаў знешняй палітыкі беларуска-літоўскай дзяржавы ў XIV ст. быў паўднёвы. Разам з асноўнай задачай аб'яднання ўсіх беларускіх земляў і далейшым наступам на ўсход, каб вызваліць ад татарскай няволі іншыя ўсходнеславянскія землі з іх далучэннем да беларуска-літоўскай тэрыторыі, мэтай вялікіх князёў літоўскіх было вызваленне з-пад татарскай няволі, ад Залатой Арды, і ўкраінскіх земляў.

Такім чынам, стрымлівалася пагроза татарскіх набегаў на землі ВКЛ і пашыралася тэрыторыя гэтай ужо даволі вялікай дзяржавы ва Усходняй Еўропе. У сярэдзіне XIV вялікаму князю Альгерду ўдалося пашырыць тэрыторыю на ўсход, далучыўшы да сваёй дзяржавы мсціслаўскую зямлю (1358). На захадзе палепшыліся адносіны з Польшчай. Брат Альгерда Кейстут вёў баі з Тэўтонскім ордэнам, з якім на пэўны час было дасягнута прымірэнне. У Залатой Ардзе ў гэты час сітуацыя была нестабільнай. Пасля забойства ў 1357 годзе хана Залатой Арды Джанібека і смерці праз два гады яго сына Бердзібека ў Ардзе пачалася міжусобная барацьба паміж рознымі ханамі. Ад 1357 да 1380 года на золатаардынскім троне змянілася больш за 25 ханаў. Пачаўся распад Залатой Арды. Альгерд выкарыстаў гэтую сітуацыю для вызвалення з-пад татарскага панавання тэрыторыі паўднёва-заходняй Русі — украінскіх земляў. Задача Альгерда заключалася ў тым, каб вызваліць украінскую тэрыторыю Кіеўскага княства, дзе кіраваў татарскі васал — князь Фёдар, і спыніць напады татараў на Валынь і Падолію.

На поўдні цяперашняй Украіны, а тады ў Дзікім Стэпе, панавалі ханы, якія кіравалі сваімі ордамі: Крымскай, Перакопскай і Джамбайлуцкай. Яны кантралявалі стэпы на поўнач ад Чорнага мора і Падолію. У «Летапісе вялікіх князёў літоўскіх» адзначаны тры браты, ханы Хачыбей, Кутлубуга і Дзімейтар. «Гэтыя тры браты, татарскія ханы, былі отчымачамі і дзедзічамі Падольскай зямлі. Ад іх імя кіравалі атаманы і баскакі, прыязджаючы ад гэтых атаманаў, збіралі з Падольскай зямлі даніну». Супраць гэтых татарскіх ханаў і павёў свае войскі Альгерд. Войска было сабрана на беларускіх землях. Ускраіна літоўскай тэрыторыі на чале з Кейстутам трымала свае сілы на Валыні на мяжы з Польшчай. Таму аснову войска Альгерда складала воінскае апалчэнне вотчынных земляў самога вялікага князя — Віцебскай, Віленскай, Менскай і Навагрудскай (з цэнтрам у Крэве).

У паход са сваімі навагрудскімі войскамі пайшлі і пляменнікі Альгерда, сыны навагрудскага князя Карыята Аляксандр, Канстанцін, Юрый і Хведар. Відаць, удзельнічалі ў паходзе і іншыя пляменнікі — князі пінскі Патрык Нарымонтавіч і заслаўскі Міхаіл Іванавіч, якія ўсе потым атрымалі надзелы ва ўкраінскіх землях. У канцы лета 1362 года войска Вялікага Княства Літоўскага было папоўнена апалчэннем з Валыні.

Кіеў быў узяты Альгердам, і замест татарскага васала князя Фёдара кіеўскім князем Альгерд пасадзіў свайго старэйшага сына Уладзіміра, замацаваўшы гэтае княства за сваёй дынастыяй і далучыўшы яго да беларуска-літоўскай дзяржавы. Ад Кіева і пачаўся непасрэдна паход у Дзікае Поле, дзе і адбылася бітва 1362 года непадалёк ад левага берага Паўднёвага Буга.

«Хроніка Літоўская і Жамойцкая» паведамляе, што, «мінуўшы Канеў і Чаркасы», Альгерд са сваім войскам пайшоў у Заходнюю Падолію да Паўднёвага Буга. Гэта быў пачатак восені. «Хроніка» паведамляе, што «ўказалася ім у полі вялікая арда з трыма царыкамі, на тры абозы падзеленая, — гэта значыць, Катлубая, Катыбея-Бекера і Дзімейтра Султана. То бачыўшы, Альгерд, што да вайны гатовы татары, падзяліў войска сваё на 6 гуфаў (палкоў), закрыўленых з бакоў».

Войска беларуска-літоўскай дзяржавы было пастаўлена ў некалькі радоў разгорнутым сярпом з высунутымі наперад флангамі. Баявы парадак беларускага войска пазбаўляў татараў магчымасці прарваць гэтыя шыхты і зайсці яму ў тыл.

Бітва пачалася нападам татараў па фронце. «А потым з вялікай запальчывасцю татары град жалезны з лукаў на літву густа пусцілі, але ім стральбою не нашкодзілі з-за ўмелага пастраення і хуткага расступлення». (Летапісец называе літвою навагародскія атрады).

Асабліва вызначыліся навагараджане з Карыятавічамі і «валілі іх з коней, напіраючы на іх з бакоў». Ваяры Альгерда стралялі па татарах і з самастрэлаў (кушаў) з каменнямі і металічнымі бомбамі. Пасля нядоўгага бою татары пацярпелі паражэнне: «Лёталі не інакш, як снапы ад гвалтоўнага ветру, татары разбітыя, а не маючы больш ад літвы бою вытрымаць, пачалі мяшацца і ўцякаць па шырокіх палях. Там жа царыкаў іх трох — Катлубая, Катыбея-Бекера і Дзімейтара Султана — забілі. І мурзаў, і ўланаў пабіта вельмі шмат. Трупаў таксама татарскіх поўныя палі і рэкі былі». Пераможцы забралі ўвесь абоз ардынскіх татараў і дзясяткі статкаў, у тым ліку і вярблюдаў. Рэшткі татарскай конніцы ўцяклі на Дунай і далей у Дабруджу. Частка войска ўцякала ў Крым.

У выніку бітвы каля Сініх Водаў 1362 года ад татарскай няволі былі вызвалены кіеўская зямля, Падолія, Чарнігаўскае княства. Гэтыя тэрыторыі ўвайшлі ў склад беларуска-літоўскай дзяржавы, якое пашырыла сваю ўладу да вусцяў Дняпра і Днястра. Як адзначае летапіс, Альгерд гэтым землям «ад татараў вольнасць учыніў». Усё гэта значна ўмацавала пазіцыі Вялікага Княства Літоўскага на Усходняй Еўропе.

